Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

10 ЛІПЕНЯ 2008 г.
ЧАЦВЕР
№ 126
(26239)

Кошт 450 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Затрыманы падазроныя ў дачыненні да выбуху ў Мінску

Супрацоўнікі КДБ Беларусі затрымалі падазроных у дачыненні да выбуху ў час канцэрта 4 ліпеня каля стэлы «Мінск — горад-герой». Аб гэтым паведаміў начальнік упраўлення КДБ па Мінску і Мінскай вобласці Ігар Кузняцоў.

Паводле яго слоў, затрыманы тры чалавекі. Сярод іх ёсць асобы, якія належаць да адной з незарэгістраваных дэструктыўных арганізацый, а таксама маюць спецыяльныя навыкі выкарыстання выбуховых рэчываў.

БЕЛТА.

Прынята новая рэдакцыя закона аб абароне правоў спажыўцоў

Прэзідэнт Беларусі 8 ліпеня падпісаў Закон «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях абароны правоў спажыўцоў».

Гэты нарматыўна-прававы акт пашырае сферу дзеяння Закона «Аб абароне правоў спажыўцоў». Цяпер у кола адказных перад спажыўцом асобаў уключаюцца не толькі прадаўцы, выканаўцы і вытворцы, але і фізічныя асобы, якія не з'яўляюцца індывідуальнымі прадпрымальнікамі, што рэалізуюць у адпаведнасці з заканадаўствам тавары (работы, паслугі) насельніцтву: рамеснікі; асобы, якія гандлююць на рынках і (або) іншых месцах не больш як 60 дзён у год; асобы, якія аказваюць паслугі аграэкатурызму. Прадугледжваецца адказнасць гарантыйных майстэрняў (рамонтных арганізацый) перад спажыўцамі за якасць і тэрміны выканання работ.

Спажывец мае права прад'явіць да пастаўшчыка або дылера патрабаванні замены або рамонту няякаснага тавару, а таксама кампенсацыі расходаў па рамонту ў выпадку банкруцтва прадаўца (вытворцы), прыпынення або спынення яго дзейнасці, адсутнасці ў спажыўца дакладных звестак аб прадаўцу (вытворцы) альбо месцы знаходжання або месцы жыхарства вытворцы за межамі Рэспублікі Беларусь. Калі ж яны не могуць выканаць такія патрабаванні, то спажывец мае права патрабаваць вяртання выплачаных грошай. Такі падыход заканадаўча аформлены і ў іншых краінах, напрыклад, у Расійскай Федэрацыі.

Закон удакладняе пералік абавязковай інфармацыі аб тавары. Вызначаны пералік інфармацыі, якая ў абавязковым парадку павінна прадастаўляцца грамадзяніну пры набыцці тавараў па Інтэрнэту, рэкламе, пошце або іншымі дыстанцыйнымі спосабамі. Так, пры рэалізацыі тавараў праз Інтэрнэт-магазін на сайце ў абавязковым парадку павінна размяшчацца інфармацыя аб вытворцы, асноўных спажывецкіх уласцівасцях, гарантыйных тэрмінах, цане і ўмовах аплаты тавараў, тэрмінах і ўмовах дастаўкі тавару.

На сёння ў дзеючым Законе «Аб абароне правоў спажыўцоў» прадастаўлена права спажыўцу на абмен тавару належнай якасці на аналагічны тавар і толькі пры адсутнасці варыянта для абмену — на вяртанне грошай. Пасля ўступлення ў сілу новага Закона спажывец будзе мець права на свой выбар на абмен або вяртанне якаснага тавару (калі тавар не быў ва ўжыванні, захаваны яго спажывецкія ўласцівасці і ёсць доказы набыцця яго ў гэтага прадаўца) на працягу 14 дзён з моманту куплі. Пры вяртанні тавару належнай якасці патрабаванне спажыўца аб вяртанні выплачанай за тавар грашовай сумы падлягае задавальненню прадаўцом неадкладна.

Замацоўваецца права спажыўца на вяртанне няякаснага тавару прадаўцу (вытворцу, пастаўшчыку, прадстаўніку) без спажывецкай тары.

Удакладняецца парадак вылічэння гарантыйных тэрмінаў для сезонных тавараў і пры рэалізацыі тавараў па каталогах, рэкламе і іншых інфармацыйных крыніцах. Прадугледжваецца, што гарантыйны тэрмін на тавар, што вырабляецца за межамі Рэспублікі Беларусь, павінен быць не менш за гарантыйны тэрмін, прадугледжаны заканадаўствам Рэспублікі Беларусь для аналагічных тавараў, якія вырабляюцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

Законам вызначаны парадак разгляду спрэчкі пры парушэнні прадаўцом тэрмінаў выканання абавязацельстваў па дагавору з папярэдняй аплатай тавару. Пры гэтым патрабаванні спажыўца аб вяртанні сумы папярэдняй аплаты і поўнай кампенсацыі страт падлягаюць задавальненню прадаўцом неадкладна (у выпадку, калі задаволіць такія патрабаванні неадкладна не ўяўляецца магчымым, яны павінны быць заданы на працягу сямі дзён), калі прадавец не дакажа, што парушэнне тэрмінаў адбылося не па яго віне.

Удасканальваецца парадак кампенсацыі страт прадаўцамі, вытворцамі, пастаўшчыкамі ў сувязі з вытворчасцю, пастаўкай і рэалізацыяй спажыўцу тавараў неналежнай якасці. Уводзіцца права прадаўца (пастаўшчыка) запатрабаваць замены тавару неналежнай якасці, вернутага спажыўцом, ад вытворцы або пастаўшчыка, які рэалізаваў яму такі тавар, а таксама кампенсацыі страт, панесеных прадаўцом (пастаўшчыком) у сувязі з аднаўленнем парушанага права спажыўца, калі іншае не прадугледжана нарматыўнымі прававымі актамі Прэзідэнта Беларусі або дагаворам.

Усе правы спажыўца, прадугледжаныя дзеючым заканадаўствам, захаваны ў поўным аб'ёме.

Закон уступіць у сілу праз шэсць месяцаў пасля яго афіцыйнага апублікавання.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ПАЛЮБАВАЦЦА, ДЫ НЕ ПАШКОДЗІЦЬ.
Ганна КІСЛЕЙКА ў час канікулаў на лясным возеры. *Камянецкі раён.*

ШКОЛЬНІК САРВАЎСЯ Ў ШАХТУ

У Мінску ў аўторак вечарам на будоўлі загінуў 16-гадовы вучань 10-га класа. Паводле звестак аддзялення інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама, бяда здарылася каля сямі гадзін вечара на вуліцы Броўкі ў будынку васьміпавярховага аб'екта, які будуецца. Школьнік па неасцярожнасці сарваўся з даху ў ліфтавую шахту. Юнак атрымаў цяжкія цялесныя пашкоджанні, ад якіх загінуў на месцы здарэння. Зараз праверкай усіх акалічнасцяў гэтага здарэння займаецца пракуратура Першамайскага раёна.

Ігар ГРЫШЫН.

Разглядаецца магчымасць увядзення аплаты за ваду па сабекошце для грамадзян, якія не ўстанавілі лічыльнікі

Грамадзяне, якія адмовіліся ўстанаўліваць індывідуальныя прыборы ўліку расходу вады, магчыма, будуць аплачваць яе па сабекошце, паведаміў учора журналістам у Мінску начальнік упраўлення камунальнай гаспадаркі і экалогіі Мінжылкамгаса Анатоль Шагун.

Паводле яго слоў, праект пастановы Саўміна аб унясенні адпаведных змяненняў у пастанову № 1332 вынесены на разгляд ва Ўрад. «У цяперашні час дзяржава субсідзіруе паслугі ЖКГ, аплачваючы розніцу паміж іх сабекоштам і ўстаноўленым тарыфам для насельніцтва. У сувязі з гэтым дзяржава мае права запатрабаваць ад тых людзей, якія не хочуць устанаўліваць лічыльнікі, аплачваць атрыманую ваду па сабекошце, — сказаў прадстаўнік міністэрства. — Гэта норма, хутчэй за ўсё, будзе прынятая, але яе ўвядуць не раней, чым пачнецца 2009 год». Анатоль Шагун нагадаў, што аснашчэнне жыллёвага фонду індывідуальнымі прыборамі ўліку вады павінна быць завершана сёлета. На сёння некаторыя грамадзяне адмаўляюцца ад устаноўкі лічыльнікаў па розных прычынах, у тым ліку ў сувязі з нізкімі даходамі, чаканнем капрамонту. Сёння нарматыўны сабекошт вады ў розных рэгіёнах Беларусі адрозніваецца. У сярэднім ён крыху больш чым у два разы перавышае ўстаноўлены тарыф на ваду.

Наталля ВЯРБІЦКАЯ, БЕЛТА.

Беларусь агучыла пазіцыю па распаўсюджванні аб'ектыўнай інфармацыі

Пазіцыя Беларусі па тэме распаўсюджвання аб'ектыўнай інфармацыі ва ўмовах глабалізацыі была агучана на Сёмай канферэнцыі міністраў інфармацыі краін Руху недалучэння (KOMINAK) у Венесуэле. Як паведамілі карэспандэнту **БЕЛТА** ў МЗС, пункт гледжання беларускага боку ў сваім дакладзе на мерапрыемстве выказала першы намеснік інфармацыі Лілія Ананіч.

Каардынацыйнае бюро Руху недалучэння зацвердзіла кандыдатуру кіраўніка беларускай дэлегацыі ў якасці намесніка старшыні канферэнцыі.

У мерапрыемстве прынялі ўдзел дэлегацыі з 70 краін свету. 20 дэлегацый удзельнічалі на ўзроўні міністраў, у той час як астатнія былі прадстаўлены іншымі службовымі асобамі. Перад удзельнікамі Сёмай канферэнцыі міністраў інфармацыі выступіў прэзідэнт Баліварыянскай Рэспублікі Венесуэла Уга Чавес.

Галоўнай тэмай дыскусіі было абмеркаванне тэмы распаўсюджвання ў свеце пазіцыі Руху недалучэння ў святле сучасных інфармацыйных і камунікацыйных тэндэнцый. Па выніках работы Сёмай канферэнцыі міністраў інфармацыі краін РН прынята сумесная дэкларацыя.

У рамках мерапрыемства адбылася кароткая размова прэзідэнта Венесуэлы з кіраўніком беларускай дэлегацыі. Яна таксама правяла шэраг двухбаковых сустрэч і дала інтэрв'ю тэлевізійнаму каналу «Тэлесур».

Першы намеснік міністра інфармацыі Беларусі Лілія Ананіч сустрэлася з намеснікам міністра інфармацыі Венесуэлы Фрэдзі Фернандэсам. На перагаворах бакі пацвердзілі неабходнасць развіцця далейшага супрацоўніцтва ў інфармацыйнай сферы. Адбылася таксама сустрэча прадстаўнікоў беларускай дэлегацыі з намеснікамі міністра інфарматыкі і сувязі Кубы Барысам Алехандра Марэна Кардовесам і першым намеснікам старшыні Інстытута радыё і тэлебачання Кубы Луісам Акоста Энэверыя. Акрамя таго, па ініцыятыве венесуэльскага боку прайшла сустрэча кіраўніка беларускай дэлегацыі з міністрам Венесуэлы па справах жанчын Марыяй Леан.

ЗАТРЫМАНЫ ЎГОНШЧЫКІ

У Гомелі і Мазыры затрыманы дзве групы падлеткаў, якія займаліся крадзяжамі аўтамабіляў. На працягу мая—чэрвеня першая ўчыняла крадзяжы аўтамабіляў «Жыгулі» — у асноўным для таго, каб пакатацца. Другая група з двух падлеткаў скрала больш за 10 адзінак тэхнікі.

ВЫЗНАЧАНЫ НОВЫЯ СТАЎКІ ЗЯМЕЛЬНАГА ПАДАТКУ І АРЭНДНАЙ ПЛАТЫ НА ЗЯМЛЮ Ў СТАЛІЦЫ

З нагоды

Для зніжэння нагрузкі для землекарыстальнікаў Указам № 365 ад 7 ліпеня 2008 года «Аб спагнанні плацяжоў за зямлю ў г. Мінску» прадугледжваецца перайсці ў сталіцы на вызначэнне памераў зямельнага падатку і арэнднай платы ў працэнтах ад кадастравага кошту зямельных участкаў. Аб якіх сумах зямельнага падатку і арэнднай платы ідзе гаворка і якім чынам новаўвядзенне паўплывае на памеры плацяжоў за зямлю фізічных і юрыдычных асобаў, рэдакцыі расказала намеснік начальніка ўпраўлення ўліку зямель і ацэнцы нерухомасці — загадчык сектара ўліку зямель і плацяжоў за зямлю Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Беларусі Наталля ПІГАЛЬ:

— Упершыню памер зямельнага падатку і арэнднай платы вызначаецца (толькі ў Мінску) зыходзячы з кадастравага кошту зямельных участкаў. Дакументам памер зямельнага падатку і арэнднай платы падлічваецца адным алгарытмам на адным узроўні. Так, калі раней арэндная плата была значна большая за зямельны падатак, то цяпер стаўкі такіх плацяжоў маюць адналькавы каэфіцыент па падобных артыкулах функцыянальнага выкарыстання зямельных участкаў.

— Такім чынам, арэндную плату зменшылі?

— Даволі істотна. Па асобных катэгорыях у некалькі разоў. Цяпер зямельны падатак і базавыя стаўкі штогадовай платы вызначаюцца ў наступных памерах: 0,015 працэнта ад іх кадастравага кошту — за зямельныя ўчасткі для размяшчэння аб'ектаў шматкватэрнай жылой забудовы; 0,05 працэнта — за зямельныя ўчасткі аб'ектаў сядзібнай жылой забудовы, аўтастаянак і гаражоў, вядзення калектыўнага садаводства і агародніцтва; 0,36 працэнта — за зямельныя ўчасткі для размяшчэння аб'ектаў грамадска-дзелавой забудовы; 1 працэнт — за зямельныя ўчасткі аб'ектаў прамысловай забудовы і 3 працэнты ад кадастравага кошту — за зямельныя ўчасткі для размяшчэння заправачных і газанапаўняльных станцый.

Памер новых ставак вызначаецца прыкладна на ўзроўні зямельнага падатку, які існуе сёння. Унутры горада стаўкі будуць вагацца ў залежнасці ад кадастравага кошту асобных участкаў.

— Раней фізічныя асобы мелі пэўныя льготы па аплаце зямельных падаткаў...

— Дакументам захоўваюцца ўсе існуючыя льготы па спагнанні платы за зямельныя ўчасткі як за юрыдычнымі асобамі, індывідуальнымі прадпрымальнікамі, так і за грамадзянамі, якія маюць на іх права.

— Згодна з Указам кіраўніка дзяржавы № 667, юрыдычныя асобы і індывідуальныя прадпрымальнікі павінны пачынаць асвойваць атрыманыя зямельныя ўчасткі на працягу шасці месяцаў, а грамадзяне — на працягу года. Гэта норма працягвае працаваць?

— Больш за тое, па тых зямельных участках, што былі выдзелены ў часовае карыстанне і своечасова не вернутыя, самавольна занятыя, занятыя да афармлення дакументаў; якія выкарыстоўваюцца не па мэтавым прызначэнні; не выкарыстоўваюцца юрыдычнымі асобамі, індывідуальнымі прадпрымальнікамі на працягу больш як шасці месяцаў, а грамадзянамі — на працягу года, зямельны падатак і арэндная плата за зямельныя ўчасткі спаганяецца ў дзесяцікратавым памеры.

— Што трэба цяпер рабіць арандатарам зямельных участкаў, каб плаціць па новых стаўках?

— Ім трэба звярнуцца ў выканкам для пераразключэння дагавораў арэнды або ўнясення ў іх змяненняў. Аўтаматычна па новым механізме спаганяцца арэндная плата з іх не будзе, бо яна налічваецца на падставе заключанага дагавора арэнды. Арандатары маюць права перазаключаць новыя дагаворы, але могуць гэтага і не рабіць, калі іх задавальняе існуючы памер арэнднай платы.

— Якім чынам карыстальнікі зямельных участкаў могуць атрымаць інфармацыю аб кадастравым кошце сваёй зямлі?

— Інфармацыю аб кошце зямельных участкаў можна адшукаць на сайце Нацыянальнага кадастравага агенцтва па нумары зарэгістраванага ўчастка або па адрасе зямельнага участка. Адрас сайта: www.nv.nca.by

— Для грамадзян зямельны падатак у сувязі з новаўвядзеннямі істотна не зменіцца?

— Так. Для большасці карыстальнікаў зямельнымі ўчасткамі Мінска зямельны падатак нават крыху зменшыцца. Зямельны падатак можа павялічыцца для тых землекарыстальнікаў, у якіх участкі знаходзяцца ў цэнтральных прэстыжных раёнах горада, дзе кадастравы кошт зямлі сапраўды вялікі.

— Дзякуй за гутарку.

Сяргей КУРКАЧ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

АЛБАНІЮ І ХАРВАТЫЮ ПУСЦІЛІ Ў НАТА

У Бруселі 9 ліпеня паслы 26 краін—членаў НАТА падпісалі пратаколы аб далучэнні Албаніі і Харватыі да альянсу.

Цяпер падпісаныя дакументы павінны быць ратыфікаваныя парламентамі ўсіх краін, якія ўваходзяць у блок, а затым перададзеныя на захоўванне ў Вашынгтон. Пасля гэтага працэдура ўступлення Албаніі і Харватыі ў альянс будзе лічыцца завершанай. Як паведамляецца, працэс ратыфікацыі звычайна доўжыцца каля года.

Нагадаем, што Албанія і Харватыя атрымалі запрашэнні ўступіць у НАТА на саміце Паўночнаатлантычнага альянсу ў красавіку 2008 года. Іншым краінам, прэтэндуючым на членства ў альянсе, адмовілі. Украіне было прапанавана дабіцца падтрымкі ўступлення краіны ў НАТА большасцю насельніцтва, Грузіі — вырашыць тэрытарыяльныя спрэчкі з Абхазіяй і Паўднёвай Асецыяй, а Македоніі — урэгуляваць спрэчку аб назве краіны з Грэцыяй.

ПОЛЬСКІЯ ГІСТОРЫКІ ЗГУБІЛІ ДАКУМЕНТЫ ПА КАТЫНІ



Супрацоўнікі польскага Інстытута нацыянальнай памяці не могуць знайсці дакументы аб катынскіх падзеях, атрыманыя імі з расійскіх архіваў у 1992 годзе. Прапажу гэтых дакументаў з архіваў ІНП афіцыйна пацвердзіў кіраўнік аддзела расследаванняў гэтага інстытута Дарыуш Габрэл, выступаючы перад дэпутатамі польскага парламента.

Упершыню адсутнасць дакументаў заўважылі яшчэ два гады таму, але тады супрацоўнікі Інстытута нацыянальнай памяці палічылі, што пераслалі гэтыя паперы ў канцылярыю прэзідэнта Польшчы. Пазней высветлілася, што там іх таксама няма. Гаворка ідзе аб афіцыйна зацверджаных расійскім бокам ксеракопіях рассакрэчаных дакументаў ЦК ВКП(б) і НКУС-КДБ СССР, якія датычацца расстрэлу больш як 20 тысяч польскіх салдатаў і афіцэраў у Катынскім лесе пад Смаленскам. Пасля апублікавання «крамлёўскіх» дакументаў у польска-расійскіх адносінах пачаўся новы этап. І ў спрэчцы з РФ Польшча, даказваючы свой пункт гледжання, апелявала менавіта да гэтых дакументаў. Польскі бок не згодны з «расійскай інтэрпрэтацыяй катынскага злачынства» ў плане адмаўлення версіі аб «генацыдзе». Польшча спрабуе перавесці «катынскую справу» пад юрысдыкцыю міжнароднага права, што пагражае Расіі нечаканымі наступствамі. Так, прэтэнзіі да Расіі, калі выходзіць з міжнародных нормаў кампенсацыі, могуць скласці да 4 млрд долараў ЗША.

У ТУРЦЫІ АБСТРАЛЯЛІ АМЕРЫКАНСКАЕ КОНСУЛЬСТВА І ВЫКРАЛІ ТРОХ ТУРЫСТАЎ

Не менш за шэсць чалавек загінулі падчас перастрэлкі, якая адбылася ў сераду побач з будынкам консульства ЗША ў Стамбуле, паведаміла CBS News.

Сярод загінулых — трое нападаючых і трое паліцэйскіх. Перастрэлка працягвалася каля 10 хвілін. Паводле папярэдніх паведамленняў, баевікі знаходзіліся ў аўтамабілі. Калі ён праязджаў побач з дыппрадстаўніцтвам, нападаючыя адкрылі агонь па паліцэйскіх, якія там дзяжурылі. Мяркуецца, што напад маглі здзейсніць тэрарысты з «Аль-Каіды» або экстрэмісты Рэвалюцыйнай народна-вызваленчай партыі-фронту.

Акрамя таго, учора ў Турцыі былі выкрадзеныя трое турыстаў з Германіі.

КАНГРЭС ЗША ПРАПАНАВАЎ АБМЕЖАВАЦЬ ПРАВА ПРЭЗІДЭНТА АБ'ЯЎЛЯЦЬ ВАЙНУ

Кангрэс ЗША мае намер абмежаваць права амерыканскага прэзідэнта на аб'яўленне вайны, піша Los Angeles Times.

Двухпартыйная камісія Кангрэса мае намер распрацаваць новы закон, і калі ён будзе прыняты, то ўжо наступны прэзідэнт ЗША не зможа пасылаць амерыканскіх салдатаў у зоны баявых дзеянняў без абавязковай згоды Кангрэса. Прапанаваны закон абавязвае прэзідэнта ЗША аправяшчаць Кангрэс аб любых магчымых баявых дзеяннях з удзелам амерыканскіх салдатаў, калі мяркуецца, што баявыя дзеянні будуць доўжыцца больш за тыдзень. З моманту атрымання прэзідэнцкага апавяшчэння Кангрэс на працягу 30 дзён павінен альбо ўхваліць, альбо забараніць правядзенне ваеннай аперацыі.

Твае правы

НАДБАЎКАМ ТРЭБА ПАЦВЯРДЖЭННЕ

Нізкая кваліфікацыя кадравых службаў, парушэнні заканадаўства кіраўнікамі арганізацый ці адсутнасць дакладнай інфармацыі аб уласных працоўных гарантыях — з'явы, на жаль, усё яшчэ нярэдкія. А адсюль і патрэба ў прававой дапамозе ці звычайных кансультацыях. З кім абавязаныя працягнуць кантракт, пры якіх умовах можна разлічваць на дадатковы водпуск за шкодную работу, калі налічваецца індэксацыя заробкаў і як аднавіць страчаныя звесткі аб стажы ці заробках? Гэтыя пытанні сталі найбольш папулярнымі падчас чарговай «выязной прыёмнай» Дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, што адбылася днямі ў Ваўкавыскім раёне.

Кадры падбірае кіраўнік

Тэма кантрактаў была і застаецца па-за канкурэнцыяй паўсюль, аднак асабліва вострай яна аказваецца ў невялікіх гарадах з абмежаванымі магчымасцямі для працаўладкавання. І, у прыватнасці, ці мае права наймальнік без тлумачэння прычын звольніць пасля заканчэння тэрміну кантракта інваліда III групы, чалавека, які адпрацаваў у арганізацыі 10 ці нават 30 гадоў, або адзінокую маці, што мае двух сыноў-студэнтаў?

— Гарантыі па працягу кантрактаў пасля заканчэння тэрміну іх дзеяння ёсць толькі ў некаторых катэгорый — жанчын з дзецьмі ва ўзросце да 5 гадоў, а таксама ў асобаў у перадпенсійным (53 гады ў жанчын або 58 гадоў у мужчын) узросце, — кажа начальнік упраўлення юрыдычнага забеспячэння і нагляду Дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы Алена Камісарава. — Апроч таго, кантракты з работнікамі з высокай кваліфікацыяй і вялікім стажам могуць заключацца на максімальны тэрмін — 5 гадоў. Праўда, гарантыі высокакваліфікаваным работнікам і работнікам з вялікім стажам павінны пацвярджацца ў калектыўным дагаворы арганізацыі.

Зноў-такі ў калдагаворы можна прадугледзець і гарантыі па працягу кантрактаў з тым жа інвалідам III групы або адзінокай маці з дзецьмі ва ўзросце больш за 5 гадоў. Калі падобны запіс тут ёсць, то гэта для арганізацыі — закон. Аднак, падкрэслівае Алена Камісарава, вызначэнне дадатковых гарантый тым ці іншым работнікам з'яўляецца не абавязкам, а толькі правам непасрэдна наймальніка.

Між тым, яшчэ адно «кантрактнае» пытанне. Ці можа наймальнік звольніць пасля заканчэння тэрміну кантракта работніка-пенсіянера, а ўжо праз некалькі дзён прыняць на гэтае ж месца новага чалавека... таксама ў пенсійным узросце?

— Вядома ж, падобная сітуацыя крыўдная, аднак з пункту гледжання заканадаўства тут ніякіх парушэнняў няма, — працягвае Алена Камісарава. — Права выбару таго ці іншага работніка належыць выключна наймальніку і дыктаваць яму якія-небудзь умовы ў даным выпадку немагчыма.

Тэст на шкоднасць

Новая працягласць водпуску — пытанне не менш актуальнае. Формула «24 каляндарныя дні плюс ад 1 да 5 дзён па кантракце» з'яўляецца цяпер адналькавай для ўсіх. Разам з тым адначасова заканадаўства прадугледжвае «надбаўку» за шкоднасць. Разлічваць на такую надбаўку могуць у тым ліку і медыцынскія работнікі. Але пры вельмі істотнай акалічнасці — шкоднасць павінна быць пацверджана атэстацыяй працоўнага месца, да таго ж такую атэстацыю неабходна правесці менавіта сёлета. Тым часам што рабіць у сітуацыі, калі праводзіць своечасаблівае «тэсціраванне ўмоў» у арганізацыі нібыта ніхто не збіраецца?

— Калі ў арганізацыі няма намеру праводзіць атэстацыю працоўных месцаў, першы і самы просты крок — напісаць заяву наймальніку, — адзначае Алена Камісарава. — Зрэшты, калі гэта не падзейнічае, можна пайсці іншым шляхам і звярнуцца ў службу аховы і дзяржаўнай экспертызы ўмоў працы Камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне свайго абласканкама.

Перавод. Або звальненне

У сувязі з рэформай з вучэбнай праграмы можа знікнуць прадмет «Сусветная мастацкая культура». У выніку настаўніца рускай мовы ў сярэдняй школе, якая апошнім часам спецыялізавалася якраз на СМК, рызыкуе застацца ўвогуле без гадзін. Тым часам кантракт з настаўнікам заканчваецца толькі ў красавіку 2009 года. Што будзе ў такой сітуацыі?

— Пакуль вучэбных планаў на новы год яшчэ няма, таму казаць аб далейшым развіцці сітуацыі можна толькі ўмоўна, — зазначае Алена Камісарава. — Тым не менш, калі прадмет «Сусветная мастацкая культура» з праграмы сапраўды знікне, у адміністрацыі школы будуць два варыянты. Першы — гэта пайсці на скарачэнне штату з папярэджаннем работніка не пазней чым за два месяцы і выплатай яму пры звальненні трох сярэднямесячных заробкаў. Ці другі — даць настаўніку гадзіны па іншых прадметах, скажам, па той жа рускай мове. Праўда, у другім выпадку работнік павінен напісаць заяву аб уласнай згодзе на перавод, і з ім неабходна заключыць новы кантракт. Прычым калі згоды на перавод настаўнік не дасць, адбудзецца зноў-такі звальненне па скарачэнні штатаў з выплатай трох сярэднямесячных заробкаў.

Катэгорый больш няма

Чалавек працаваў бухгалтарам II катэгорыі. Потым звольніўся, а праз некаторы час уладкаваўся ўжо ў іншым месцы на час знаходжання асноўнага работніка ў дэкрэтным водпуску. Аднак на новым месцы бухгалтара прынялі як... спецыяліста без катэгорыі. Ці правільна гэта?

— У гэтым выпадку ніякіх парушэнняў з боку наймальніка няма, — заўважае Алена Камісарава. — Справа ў тым, што былі ўнесеныя змяненні ў інструкцыю аб парадку выкарыстання Адзінай тарыфнай сеткі. І згодна з гэтымі змяненнямі, катэгорыі аказаліся выключанымі ўвогуле. Інакш кажучы, цяпер у арганізацыях ужо няма спецыялістаў I ці II катэгорыі — ёсць проста спецыялісты.

«Пенсійны нуль» змяняецца праз суд

Адна з па-сапраўднаму няпростых праблем — страта неабходных пры прызначэнні пенсіі дакументаў аб стажы і заробках. Падобныя сітуацыі сустракаюцца ў абсалютнай большасці раёнаў. Таму варта нагадаць яшчэ раз: дакументы аб рабоце павінны захоўвацца на працягу 75 гадоў. І ў выпадку, калі яны не захаваліся ў арганізацыі ці ў архівах, стаж можна пацвердзіць па паказаннях сведак у судзе. Адно, што суд прыме да ўвагі сведчанні як мінімум двух чалавек, якія працавалі з заяўнікам у адным месцы, у той жа час і могуць пацвердзіць гэта дакументальна.

— Апроч таго, калі па віне наймальніка не захаваліся дакументы аб заробках, варта зноў-такі звярнуцца ў суд, — падкрэслівае намеснік старшыні Камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Гродзенскага аблвыканкама Ніна Ціхановіч. — Для аднаўлення звестак суд можа прыняць да ўвагі ўскосныя доказы (прафсаюзныя ці партыйныя білеты з указаннем узносаў, разліковыя лісткі, выпіскі са штатнага раскладу і г.д.), паказанні прынамсі двух сведак, што ведаюць заяўніка па сумеснай рабоце, у рэшце рэшт, можа выznачыць заробак па паказчыках сярэдняй аплаты працы работніку падобных прафесій і пасад за «страчаны» час.

Сяргей ГРЫБ.

Ваўкавыскі раён.

ISSN 1990 - 763X

9 771990 763008 08126

КУРСЫ ВАЛЮТ

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 10.07.2008 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 122,00
1 еўра	3 326,77
1 латвійскі лат	4 733,97
1 літоўскі літ	963,56
1 чэшская крона	141,14
1 польскі злоты	1010,72
1 расійскі рубель	90,63
1 украінская грыўня	460,80

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ

USD	23,4147
10 UAH	51,0402
1000 BYR	11,0278
EUR	36,7822

Курс у гандлёвых кампаніях (на 9.07.2008 г.)

USD 2135 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

Дзяржкантроль

БЮДЖЭТНЫЯ СРОДКІ ТРЭБА БЕРАГЧЫ

Гэту зусім не новую, але па-ранейшаму актуальную думку падкрэсліў Зянон Ломаць на выязным пасяджэнні Камітэта дзяржаўнага кантролю Беларусі ў Гродне. Былі разгледжаны вынікі праверкі выканання мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі Гродзенскай вобласці заканадаўства ў сферы фінансавых і падатковых адносінаў, а таксама парадку адчужэння нерухомай маёмасці, што знаходзіцца ў камунальнай уласнасці.

Зянон Ломаць падкрэсліў, што ў 2005 годзе гэта праблема ўжо разглядалася Камітэтам дзяржкантролю, аднак неабходных высноў кіраўніцтвам Гродзенскага аблвыканкама не зроблена. З 90 праверaных арганізацый вобласці практычна ва ўсіх (91 працэнт) дапушчаны парушэнні пры расходаванні бюджэтных сродкаў. А ўвогуле не па мэтавым прызначэнні і з парушэннем заканадаўства выкарыстана 18,2 мільярда рублёў, з якіх 15,5 мільярда — гэта сродкі з інавацыйнага фонду.

— Гэтыя грошы ў першую чаргу павінны накіроўвацца на мадэрнізацыю вытворчасці, укараненне новых тэхналогій. Замест гэтага яны выкарыстоўваюцца для «латання дзірак» у фінансава-гаспадарчай дзейнасці, — адзначыў кіраўнік Камітэта дзяржаўнага кантролю Беларусі.

Акрамя таго, у вобласці парушаюцца гранічныя памеры гарантый, якія прадастаўляюцца мясцовымі органамі па банкаўскіх крэдытах. З году ў год назіраецца тэндэнцыя росту працэнтных расходаў пры выкананні гарантый па крэдытах, а таксама пры іх пагашэнні. У 2006—2007 гадах гэтыя расходы, якія з'яўляюцца дадатковымі для абласнога бюджэту, склалі 63,8 мільярда рублёў.

Сур'ёзныя пралікі выяўлены праверкай і ў выкарыстанні дзяржаўнай маёмасці.

— У вобласці маецца больш за 800 тысяч квадратных метраў свабодных плошчаў, а фонд «Гроднааблмаёмасць» за мінулы год умудрыўся правесці ўсяго 13 аўкцыёнаў, — адзначыў Зянон Ломаць.

А вось як разумеюць зямельнае заканадаўства ў Капцёўскім сельвыканкаме Гродзенскага раёна. 12 зямельных участкаў прадаставілі людзям, якія не значацца сярод маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Прычым у 11 выпадках участкі выдзелены за некалькі дзён да ўступлення ў сілу Ўказа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 58 ад 28 студзеня 2006 года, згодна з якім яны маглі быць прадастаўлены толькі па выніках аўкцыёну. Гэта, зыходзячы з сярэдняга кошту рэалізаваных на аўкцыёнах у 2006—2007 гадах участкаў у гэтым раёне, дазволіла б папоўніць бюджэт на 450 мільёнаў рублёў. Альбо гэтыя зямельныя ўчасткі маглі быць прадастаўлены людзям, якія сапраўды маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, а іх у Капцёўскім сельвыканкаме на 1 студзеня 2006 года было 50 чалавек.

Па выніках пасяджэння калегіі Камітэта дзяржаўнага кантролю прыняты канкрэтныя рашэнні па ўстараненні выяўленых парушэнняў, Гродзенскаму аблвыканкаму прапанавана прыцягнуць да адказнасці, аж да вызвалення з пасады, шэраг службовых асобаў.

Пытанні эфектыўнага выкарыстання бюджэтных сродкаў былі разгледжаны і падчас наведвання Зянонам Ломацем пасёлка Сапоцкін і аб'ектаў інфраструктуры Аўгустоўскага канала.

— У рэканструкцыю Аўгустоўскага канала ўкладзена каля 40 мільярдаў рублёў дзяржаўных сродкаў, аднак ён не дае той аддачы, якую павінен, — адзначыў Зянон Ломаць. — Інфраструктура, сэрвіснае абслугоўванне амаль ніякія. Задачы, якія былі ўскладзены на аблвыканкам, не выкананы.

І сапраўды, дзе даўно абяцаныя летнія і ўсесезонныя кафэ, рэстаран-млын, фарэлевыя ставы, гасцініца, летняя эстрада? Акрамя таго, у Камітэта дзяржкантролю ёсць інфармацыя аб штучных перашкодах для прыватнага бізнэсу. Чым інакш можна патлумачыць рашэнне аб зносе закінутага будынка цаглянага завода ў Рынкаўцах, дзе індывідуальны прадпрымальнік хацеў абсталяваць кафэ?

— Увагі да такіх унікальных аб'ектаў, як Аўгустоўскі канал, крайне недастаткова, і ў першую чаргу з боку рэспубліканскіх органаў, Міністэрства спорту і турызму, — падкрэсліў Зянон Ломаць. — Трэба пачынаць з шырокай рэкламы і прыцягнення інвестыцый, паколькі зрабіць усё за кошт бюджэту вобласці нерэальна. Пры гэтым не трэба разлічваць, што сюды валам паваляць замежныя турысты. Мы павінны стварыць належныя ўмовы ў першую чаргу для нашых грамадзян. Будуць гэтыя ўмовы створаны для нас саміх — будуць і госці з замежжа. Прычым пры развіцці інфраструктуры трэба прадумаць, каб гэты аб'ект выкарыстоўваўся круглагадова, а не толькі ў летні перыяд.

Зянон Ломаць паставіў перад мясцовымі органамі задачу распрацаваць дакладную праграму па стварэнні інфраструктуры і выкарыстанні турыстычнага патэнцыялу Аўгустоўскага канала, падабаючыся яе падтрымку на рэспубліканскім узроўні.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Прамая лінія

БЕЗ ЦЫРОЗУ І ГАСТРЫТУ, ЯЗВЫ І ПАНКРЭАТЫТУ

На пытанні чытачоў адказвае дацэнт 2-й кафедры ўнутраных хваробаў Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, кандыдат медыцынскіх навук Мікалай КАПРАЛАЎ

(Працяг. Пачатак у нумарах за 5, 8, 9 ліпеня.)

☎— Надзея Андрэеўна. Мне 78 гадоў. Некалькі гадоў — кіста на печані, але яна мяне не непакоіць. Сёлета ж я двойчы праходзіла «зонд», і выявілі атрафіраваную слізістую абалонку страўніка. Прызначалі пепсін... Скажыце, калі ласка, што гэта азначае? Як пазбавіцца пякоткі, якая не пакідае мяне пастаянна?

— Што датычыцца кісты, то яе дастаткова назіраць. А слізістая страўніка проста атрафіруецца з узростам. У адных людзей гэта можа быць больш выражана, у другіх — менш. Гэта не небяспечная сітуацыя, але яна можа правакаваць некаторыя «нязручнасці», паколькі ў час атрафіі змяншаецца ўзровень салянай кіслаты ў страўніку. Таму вам і прызначалі пепсін, каб папоўніць колькасць салянай кіслаты. Я б вам парэкамендаваў яшчэ часта і дробна харчавацца...

— Гэта я раблю...

— Неабходна папярэдзіць закідванне змесцівa страўніка ў страваход, што і абумоўлівае пякотку. Такім дзеяннем валодае матыліўм. Ён будзе папярэдзваць механізм закіду страўнікавага асяроддзя ў страваход. А для павышэння кіслотнасці ў перыяд пякотки я не раіў вы вам прымаць пепсін і пепсідзін... Вам трэба даследаваць узровень салянай кіслаты. Які ён — павышаны ці паніжаны? Таму што і адзін, і другі стан можа выклікаць пякотку, але прэпараты неабходна выкарыстоўваць пры гэтым розныя. Пры павышанай паказаны алмагель, гефал, фосфалюгель, маалокс.

— Урач гаварыў мне, што кіслотнасць нізкая...

— Калі гэта сапраўды так, і вам лабараторным шляхам даследавалася кіслотнасць, то можна выпраўляць сітуацыю і з дапамогай харчовых прадуктаў. Піце чай з лімонам, гранатавы сок — яны валодаюць добрым кіслотастымулюючым дзеяннем.

☎— Лоеў, Мікалай Іванавіч турбуе. Мне 46 гадоў. Зрабілі ўльтрагук печані і брушной поласці. Дыфузныя змяненні ў печані, дыскенізія жоўцевыводзячых шляхоў. Білірубін — 10, халестэрын — 6,5...

— Невялікае павышэнне халестэрыну, але гэта не страшна. Арганізм ваш сталее, запавольваюцца абменныя працэсы, у тым ліку і халестэрынавы. Паспрабуйце стрымліваць гэту сітуацыю з дапамогай дыеты — не ўжывайце жывёльных тлушчаў. Неабходна больш рухацца.

— Тлушчы я не ўжываю, але 1-2 разы на тыдні выпіваю...

— Гэта вельмі дрэнна. Неабходна адмовіцца ад ужывання алкаголю наогул. Нават ад піва. Справа ў тым, што ў вас ёсць дыстрафічныя змяненні. У далейшым, калі вы будзеце працягваць ужываць алкаголь, магчыма развіццё сур'ёзных захворванняў печані і падстраўнікавай залозы.

☎— Гродна, Валерый. Лячыўся з калітам у 2-й гарадской бальніцы Гродна. Мяне не задаволіла лячэнне. Болі не спыняюцца. Прэпараты не дапамагаюць. Папрасіў накіраванне ў Мінск. Сказалі, што з такім дыягназам мне яно не належыць. Куды звярнуцца, каб атрымаць накірунак і, адпаведна, нармальнае лячэнне? Болі толькі павялічваюцца і стан пагаршаецца.

— Каліты бываюць розныя. Мяркую, што вы — стацыянарны хворы гастраэнтэралагічнага аддзялення. Ваша захворванне можна паспяхова лячыць у лячэбных установах Гродна.

— А як атрымаць накіраванне ў Мінск?

— На жаль, рэспубліканскага цэнтра па гастраэнтэралогіі ў нашай краіне няма. У Мінску гэтымі праблемамі займаюцца 1-я, 2-я, 3-я, 6-я і 9-я гарадскія бальніцы. Адміністрацыя вашай гарадской бальніцы пры неабходнасці можа дамовіцца з адміністрацыяй вышэйпамянёных устаноў аб вашым прыёме на лячэнне. Калі станоўчай размовы не атрымаецца, трэба выходзіць з просьбай на гарадскі і абласны аддзелы аховы здароўя.

— Скажыце, а наколькі інфарматыўным можа быць ультрагукавое даследаванне кішэчніка?

— Менш інфарматыўным, чым коланаскапія, якая выконваецца зараз і пад наркозам, і з выкарыстаннем рэлаксантаў.

☎— Дзень добры! Мяне завуць Аляксандр Пятровіч. Пакутую ад пякоткі. І не так даўно заўважыў, што ў той дзень, калі ў мяне здараецца прыступ пякоткі, абавязкова надыходзіць і прыступ бранхіяльнай астмы. Ці ёсць тут якая-небудзь сувязь? Што вы параіце?

— Наш страваход звязаны з бронхамі. Таму ў некаторых хворых бранхіяльная астма развіваецца ў сувязі з закідам кіслага ўтрымання страўніка. Калі змесціва са страўніка трапляе ў прасвет бронхаў, там фарміруецца запаленне. І гэта можа скончыцца бранхіяльнай астмай. Такім чынам, у некаторых хворых прыступу астмы і нават стэнакардыі папярэднічае пякотка. Неабходна абследавацца. У нас ёсць унікальны метад — 24-гадзіннага камп'ютарнага назірання. З дапамогай гэтага метаду страваводнай працяглай Ph-метрыі вымяраем кіслотнасць ў страўніку і страваводзе. Мы можам падабраць індывідуальнае лячэнне, паколькі частка людзей не адчувальная да некаторых прэпаратаў...

— А што варта выключыць з рацыёну?

— Пры гастраэзафагеяльнай рэфлюкснай хваробе выключаюцца ўсе прадукты, якія стымулююць павышэнне кіслотнасці. Але зараз ёсць моцныя антыкіслотныя прэпараты працяглага дзеяння. Лансапразол, рабепразол, эзамепразол — адна таблетка гэтых прэпаратаў дзейнічае суткі. Акрамя таго, трэба мець пад рукой антацыдныя прэпараты — алмагель, маалокс, фасфалюгель, гефал і іншыя. Яны надзвычай эфектыўныя.

☎— Тамара Мікалаеўна, Полацк. У мяне — язва 12-перснай кішкі. Вось ужо чатыры гады як язва не непакоіць, але двойчы ў год, па восені і вясне, я праводжу прафілактыку — п'ю па адной таблетцы амезу на ноч. Ці варта рабіць гэта ў жніўні-верасні?

— Асенне-вясновая прафілактыка зараз не абавязковая, язва страціла сваю сезоннасць. Бактэрыя, якая яе выклікае, насамрэч не рэагуе на час года. Калі язва — дуадэнальная, то абавязкова трэба прайсці тэрапію па вынішэнні Helicobacter pylori. Гэта адзіны спосаб спыніць рэцыдывы захворвання. Калі сімптомаў захворвання няма, амез можаце не ўжываць. Вам трэба толькі прайсці антырэцыдыўны курс, пасля якога можна лічыць сябе здаровай.

— А што можна пры маім захворванні прыгубіць за сталом — гарэлкі ці віна?

— Непажадана ні адно, ні другое.

☎— Мінск, звоніць Вольга Пятроўна. У нованароджанага ўнука — гемахраматоз. Скажыце, што гэта за захворванне? Ці перадаецца ў спадчыну? Як яго лячыць?

— Гемахраматоз, або пігментны цыроз печані — гэта захворванне, пры якім адбываецца ўзмацненне ўсмоктвання жалеза ў кішэчніку, павышэнне яго ўзроўню ў печані. Захворванне рэдкае: адзін хворы рэгіструецца на 100 тысяч насельніцтва. Мае спадчыннае паходжанне. Але можа быць і набыты варыянт — пры алкагалізме, гемалітычнай анеміі. Прагноз захворвання без лячэння дрэнны. Пры гемахраматозе неабходна вытрымліваць дыету: выдаляюцца з рацыёну ўсе прадукты, якія ўтрымліваюць жалеза, — яйкі, масла, шакалад, печань і іншыя. Асноўнымі лекавымі прэпаратамі з'яўляюцца сродкі, якія выводзяць жалеза з арганізма. Лячэнне працяглае, пад кантролем урача.

☎— Навагрудак, Алена. Часам у мяне баліць пад «лыжачкай». Тэрапеўт накіроўвае на эндаскапічнае абследаванне. Ці можна абысціся без гэтай працэдуры?

— Пры болях у праекцыі страўніка эндаскапічнае абследаванне становіцца абавязковым. На сёння немагчыма і недапушчальна па адным сімптоме разважаць над тым, што ў цябе мае быць — гастрыт, язва, эрозія ці дыспепсія. Сімптомы, па сутнасці, аднолькавыя. Дыскамфорт у вобласці страўніка з'яўляецца абавязковым паказаннем для эндаскапічнага даследавання.

☎— Васіль Пятровіч з Гродна тэлефануе. У мяне гастрыт з павышанай кіслотнасцю. Сёлета адпачываў у Турцыі. Каштаваў мясцовую кухню. І цяпер перыядычна пакутую ад рэзі і пякоткі. Як пазбавіцца непрыемных адчуванняў?

— Неабходна зрабіць гастраскапію. Магчыма, у вас — рэцыдыўў гастрыту з эрозіяй або рэцыдыўў язвы, чаму паспрыяла ежа, якая стымулюе кіслотнасць — галоўную прыкмету разбурэння слізістай абалонкі.

☎— Валянціна з Мінска. Падкажыце, дзе ў нас можна вызначыць кіслотнасць?

— Даследаваннем кіслотнасці ў Мінску займаюцца 1-я і 9-я гарадскія клінічныя бальніцы.

«Прамую лінію» правялі Святлана БАРЫСЕНКА і Вольга ШАЎКО.

(Заканчэнне будзе.)

«ПРЫЗАВЫЯ» ТЭЛЕВІЗАРЫ АД «ЗВЯЗДЫ» — У КОЖНУЮ ВОБЛАСЦЬ

Ва ўчарашнім нумары газеты мы праанансавалі штокварталь-ны розыгрыш прызоў. На гэты раз мы падвялі вынікі падпіскі на II паўгоддзе (3-і квартал) 2008 года. Прыемна адзначыць, што «Звязда» захавала сваю чытацкую аўдыторыю. Шкада толькі, што падпісныя купоны прыхільнікі найстарэйшага беларускамоў-нага выдання пасылалі не вельмі актыўна. Хоць чаму здзіўляц-ца: на дварэ лета і многім проста не да гульняў — паспець бы на дачы ці ў адпачынак.

Усяго на розыгрыш было даслана каля паўтары тысячы «квіткоў».

ВОСЬ ЯК РАЗМЕРКАВАЎСЯ ЎВЕСЬ ПРЫЗАВЫ ФОНД

Бейсболка з фірменным лагатыпам «Звязды»

Віннік Лілія Анатольеўна, г. Ганцавічы, Брэсцкая вобласць

Саўчанка Тамара Фёдараўна, в. Рудня, Полацкі раён, Віцебская вобласць

Трухан Валянціна Канстанцінаўна, в. Камаровічы, Петрыкаўскі раён, Гомельская вобласць

Цяцерына Рэгіна Станіславаўна, г. Смаргонь, Гродзенская вобласць

Сачанка Таццяна Уладзіміраўна, г. Гluск, Магілёўская вобласць

Костачка Віктар Раманавіч, в. Мянюткі, Маладзечанскі раён, Мінская вобласць

Спецыян Леанід Іосіфавіч., г. Мінск

Майка з фірменным лагатыпам «Звязды»

Мартыненка Лідзія Аляксандраўна, г. Мікашэвічы, Лунінецкі раён, Брэсцкая вобласць

Шэкелеўская Ніна Дзмітрыеўна, в. Пятровічы, Шаркаўшчынскі раён, Віцебская вобласць

Казакова Ніна Аляксандраўна, в. Коўчыцы-2, Светлагорскі раён, Гомельская вобласць

Славінскі Іван Георгіевіч, в. Скрынева, Навагрудскі раён, Гродзенская вобласць

Голуб Ева Сцяпанаўна, в. Макаравічы, Бабруйскі раён, Магілёўская вобласць

Міцько Яўген Сцяпанавіч, п. Ратамка, Мінскі раён

Зуева Ніна Іванаўна, г. Мінск

Настольны гадзіннік з лагатыпам «Звязды»

Скакун Леанід Рыгоравіч, в. Леоталь-6, Іванаўскі раён, Брэсцкая вобласць

Арлова Галіна Мацвееўна, в. М. Давыдкі, Глыбоцкі раён, Віцебская вобласць

Журавель Іосіф Нічыпаравіч, в. Раманаўка, Мазырскі раён, Гомельская вобласць

Бадак Нэлі Паўлаўна, в. Старая Спуша, Шчучынскі раён, Гродзенская вобласць

Лаўшук Аляксей Сцяпанавіч, г. Магілёў

Чаркас Валянціна Адамаўна, в. Дзярэчынцы, Стаўбцоўскі раён, Мінская вобласць

Бобла Іван Мацвеевіч, г. Мінск (праспект газеты «Звязда»)

Каляровы тэлевізар «Віцязь»

Куркач Святлана Аляксандраўна, г. Ляхавічы, Брэсцкая вобласць

Красоўская Надзея Мікалаеўна, п. Коханава, Талачынскі раён, Віцебская вобласць

Сасноўскі Антон Іванавіч, г.п. Лельчыцы, Гомельская вобласць

Пазлевіч Каятан Іванавіч, в. Завідзіенты, Астравецкі раён, Гродзенская вобласць

Карпенка Дар'я Фёдараўна, г. Слаўгарад, Магілёўская вобласць

Цуба Надзея Рыгораўна, в. Хорастава, Салігорскі раён, Мінская вобласць

Гаральчук Іван Іванавіч, г. Мінск

Халадзільнік «Атлант»

Бондар Людміла Дзмітрыеўна, г. Рэчыца, Гомельская вобласць

Яшчэ раз віншуем усіх шчаслівчыкаў з прызамі. Спадзяёмся, што ў наступны раз фартуна ўсміхнецца і іншым нашым падпісчыкам.

Просім прабачэння, калі ў спісы раптам закралася недакладнасць, бо не ўсе населеныя пункты, прозвішчы і імёны напісана разборліва.

Свае прызы, паважаныя чытачы, вы можаце атрымаць у рэдакцыі, пачынаючы з сённяшняга дня (кант. тэл. 8 017 287 17 79). Праўда, суперпрызы — халадзільнік і 7 тэлевізараў — супрацоўнікі «Звязды» дастаўляць нашым лаўрэатам па месцы іх жыхарства ў пачатку наступнай падпісной кампаніі і ўручаць ва ўрачыстай абстаноўцы на сустрэчы.

Заставайцеся з намі!

КАБ НЕ ЗГАС ТВОРЧЫ АГЕНЬЧЫК

Ушанаванне ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны — членаў творчых саюзаў пісьменнікаў Беларусі і кінематаграфістаў — адбылося ў сталічным кінатэатры «Цэнтральны».

Віншавальныя словы ветэранам-творцам дарылі старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай Чаргінец, старшыня Саюза кінематаграфістаў Юрый Цвяткоў, пасол Расіі ў нашай краіне Аляксандр Сурыкаў, народная артыстка Беларусі Марыя Захарэвіч.

Марыя ЖЫЛІНСКАЯ. Фота аўтара.

Пісьменнік Алесь ШАЖКОЎ і гукааператар Барыс ШАНГІН.

ДЗЕЛЯ ЎМАЦАВАННЯ ТРАДЫЦЫЙ ПРАВАСЛАЎЯ

Рашэннем Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі аказана бязвыплатная дапамога Супрасльскаму Благавешчанскаму манастыру — найстарэйшаму цэнтру праваслаўя ва Усходняй Еўропе, які сёння знаходзіцца на Беласточчыне ў Польшчы.

Зроблена гэта, як адзначаецца ў паведамленні прэс-службы МЗС нашай краіны, у мэтах спрыяння духоўнаму адраджэнню і ўмацаванню традыцый Праваслаўнай царквы. Са свайго боку пасольства Беларусі ў Польшчы і Генеральнае консульства Беларусі ў Беластоку пастаянна аказваюць садзейнічанне ў вырашэнні арганізацыйных пытанняў і ў дастаўцы будаўнічых матэрыялаў на тэрыторыю Польшчы. Так, для аднаўлення Храма Уваскрэсення Хрыстова і рэканструкцыі катакомбаў адкрытым акцыянерным таварыствам «Краснасельскбудматэрыялы» было перададзена 15 тон цэменту і 5 тон вапны. Зараз рыхтуецца перадача манастыру металаканструкцый, іншых неабходных для аднаўлення будынка матэрыялаў, а таксама камплекта беларускіх дываноў для праваслаўнага Храма.

Нагадаем, Супрасльскі Благавешчанскі манастыр заснаваны ў 1498 годзе. На працягу многіх стагоддзяў манастыр праводзіць актыўную асветніцкую дзейнасць па распаўсюджванні праваслаўнай веры сярод мясцовага насельніцтва. Прадстаўнікі праваслаўнага духавенства і спецыялісты называюць Супрасльскі манастыр духоўнай і архітэктурнай жамчужынай Беласточчыны.

Леанід ТУГАРЫН.

«Абвастрэнне сітуацыі на сусветным рынку прадуктаў харчавання выгаднае для Беларусі»

Менавіта гэтыя словы намесніка старшыні Прэзідыума НАН Беларусі Уладзіміра Гусакова сталі своеасаблівым лейтматывам праведзенай учора прэс-канферэнцыі па пытаннях сусветнага харчовага крызісу. Паводле яго слоў, крызіс на рынку прадуктаў харчавання ў краінах Еўропы дасць магчымасць Беларусі нарошчваць пастаўкі сельгаспрадукцыі на рынкі гэтых дзяржаў, прыцягваючы ў краіну дадатковыя сродкі на развіццё нацыянальнай эканомікі.

Харчовая праблема сёння сапраўды з'яўляецца адной з самых вострых у свеце, паступова ператвараючыся ў праблему палітычную: каля 1 млрд людзей на Зямлі штодзень галадаюць ці недаядаюць. Прычым такая сітуацыя застаецца нязменнай ужо працяглы час. Вядома, што развітыя еўрапейскія краіны стварылі магутныя рэзервы прадуктаў харчавання, таму там размова аб небяспецы не ідзе. Больш складаная сітуацыя склалася ў маларазвітых дзяржавах.

Беларусь сёння знаходзіцца ў стане стабільнага развіцця, уласнымі сіламі ў нас выпускаецца амаль 90 працэнтаў прадуктаў харчавання і толькі каля 10 працэнтаў харчовых тавараў завозяць у краіну. Гэта адбываецца па прычыне таго, што нашы кліматычныя і геаграфічныя ўмовы не дазваляюць мець уласныя морапрадукты, чай, каву, алей, цвёрдыя гатункі пшаніцы.

У нашай краіне распрацоўваецца і ўдакладняецца канцэпцыя харчовай бяспекі, згодна з якой на кожнага беларуса разлічана каля 3000 ккал у дзень, што адпавядае стандартам развітых дзяржаў, саступаючы пакуль толькі па разнастайнасці прадуктаў, але і гэтая праблема вырашаецца.

Вучонымі Акадэміі навук і спецыялістамі сельскай гаспадаркі разлічаны мінімальныя аб'ёмы самых неабходных прадуктаў. Так, штогод дзяржава мае неабходнасць у 5,5—6 млн т зерня (у апошні год Беларусь выйшла на 7,2 млн т, што блізка да аптымальнага паказчыка ў 8—9 млн, які плануецца дасягнуць у хуткім часе), у 6—6,5 млн т бульбы (амаль 9 млн за 2007 год) і г.д. Паводле слоў першага намесніка міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь Надзеі Каткавец, пашырацца асартымент неабходных прадуктаў, і такая тэндэнцыя вельмі радуе, бо гэта сведчыць аб росце матэрыяльнага дабрабыту нашых грамадзян.

Экспарт беларускіх прадуктаў харчавання сёння перавышае імпарт, таму перад краінай стаіць праблема выгаднага вывазу айчыннага тавару за мяжу. У 2007 годзе было вывезена за мяжу прадуктаў харчавання на суму 1 млрд 200 млн долараў, а сёлета за пяць месяцаў гэта лічба наблізілася да 677 млн долараў. Дзяржава супрацоўнічае з 33 краінамі свету, у тым ліку з азіяцкімі краінамі, Венесуэлай, Сірыяй. Умовы экспарту змяняюцца, становяцца больш жорсткімі, беларускія прадпрыемствы харчовай прамысловасці паступова выходзяць на еўрапейскія стандарты вытворчага працэсу. Да нас прыязджаюць інспекцыі з Расіі з мэтай сертыфікацыі якасці прадуктаў, кантралююцца таксама і сыравінныя зоны.

Паляпшаецца становішча з пастаўкай айчыннай сыравіны і гародніны, хуткімі тэмпамі паніжаецца яе імпарт. 2007—2008 гады сталі перыядам глабальнага тэхнічнага перавароту: на 21 прадпрыемстве краіны гэтай галіны адбыліся якасныя тэхнічныя пераўтварэнні. Сёння беларускія вытворцы кансерваў, сокаў і дзіцячага харчавання робяць акцэнт на асартымент прадукцыі, яе якасць, а таксама — на дызайн тары. Цяпер даводзіцца набываць за мяжой толькі кукурузу, цытрусавую і экзатычную садавіну, але і гэта праблема вырашаецца, у Брэсцкай вобласці, напрыклад, на адным прадпрыемстве наладжана вытворчасць канцэнтратаў з персікаў, у Тураве пачынаюць рабіць кансервы з кукурузы.

Не абмінаюць увагай вытворцы і праблему дзіцячага харчавання. Асартымент харчовых вырабаў для маленькіх беларусаў дасягнуў сотні найменняў.

Такім чынам, Беларусі не пагражае харчовы крызіс, больш за тое, плануецца павялічыць аб'ём экспарту і зменшыць аб'ём імпарту за кошт асваення самых сучасных тэхналогій і пашырэння вытворчасці.

Вольга ДАМАРАЦКАЯ.

ДЫПЛОМ ДАСЛЕДНІКА — БЕЗ КАНДЫДАЦКАЙ...

Цяпер вядзецца работа над законапраектам, у якім прадугледжваецца, што маладыя людзі, якія скончылі аспірантуру і паспяхова прайшлі выніковую атэстацыю, але па нейкіх прычынах не абаранілі кандыдацкую дысертацыю, будуць атрымліваць дыплом даследніка.

Пра гэта паведаміў намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Ігар Войтаў на рэспубліканскім семінары «Прававое рэгуляванне пытанняў падрыхтоўкі навуковых работнікаў вышэйшай кваліфікацыі». Акрамя таго, разам з дыпломам у праекце прадугледжана і матэрыяльнае стымуляванне — надбаўка да заробку ў памеры дзвюх ставак першага разраду.

Гэтая мера прызвана паменшыць стрэс, які адчувае ўчарашні аспірант, калі пасля даволі высокай стыпендыі пачынае атрымліваць даволі сціплы заробак на новым месцы размеркавання. Праўда, у праекце прадугледжана, што спецыяліст, які атрымаў дыплом даследніка, павінен на працягу блізкіх трох гадоў усё ж абараніць кандыдацкую дысертацыю, ці штогод пацвярджаць сваё званне даследніка практычнай інавацыйнай дзейнасцю.

Цяпер памер стыпендыі аспіранта складае 538,2 тысячы рублёў, дактаранта — 656,4 тысячы. Пакуль што неўрэгуляваным застаецца пытанне памеру стыпендыі аспіранта, які працуе.

Сёлета за сродкі рэспубліканскага бюджэту плануецца прыняць 1444 аспіранты і 46 дактарантаў. Значны прырост чакаецца ў галіне медыцынскіх і хімічных навук. Памяншэнне прыёму аспірантаў назіраецца ў галіне тэхнічных, сельскагаспадарчых, грамадскіх і гуманітарных навук.

Інга МІНДАЛЁВА.

«ВЕСНАВОЕ ПАЛЯВАННЕ НА ВАДАПЛАЎНЫХ ПТУШАК НЕАБХОДНА АБМЕЖАВАЦЬ»

З гэтым меркаваннем згадзіліся ўдзельнікі «круглага стала» на тэму «Дзяржаўная палітыка ў галіне вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання», што адбыўся ў Грамадскім прэс-цэнтры Дома прэсы.

Сёння плошча арандуемых паляўнічых угоддзяў у краіне складае 16,6 млн га, з якіх доля лясных тэрыторый складае 41,8 працэнта, палявых — 52,2 і воднабалотных — 6 працэнтаў. Цяпер у Беларусі больш за 156 тысяч паляўнічых, якія маюць адпаведныя пасведчанні дзяржаўнага ўзору. Летась на арандуемых плошчах паляўнічымі было здабыта 18,3 тысячы дзікіх капытных жывёл, што на 53 працэнты больш, чым у папярэднім сезоне.

Паводле інфармацыі кансультанта ўпраўлення паляўнічай гаспадаркі Мінлясгаса Віктара Карагвіча, за апошнія 3 гады колькасць буйных дзікіх жывёл у нашай краіне істотна павялічылася.

За гэты час больш чым у тры разы быў павялічаны ліміт на адстрэл дзікоў, які сёлета склаў 17 тысяч асобін. Увогуле, сёння на тэрыторыі Беларусі налічваецца больш за 50 тысяч кабаноў, якія цяпер усё часцей пачалі рабіць масавыя набегі на сельскагаспадарчыя ўгоддзі побач з невялікімі вёскамі.

А вось сітуацыя з вадаплаўнымі птушкамі ў апошнія гады толькі пагаршаецца: спецыялісты адзначаюць катастрафічнае зніжэнне колькасці менавіта качыных відаў птушак, на якіх дазваляецца паляванне. Істотна папуляцыю вадаплаўных птушак Беларусі змяншаюць такія агрэсіўныя драпежнікі, як амерыканская норка і янотападобны сабака. Аднак мацней за ўсё качыныя птушкі пакутуюць ад веснавога палявання, якое ў нашай краіне працягваецца больш за два месяцы.

Паводле слоў вядучага навуковага супрацоўніка Навукова-практычнага цэнтра па біярэсурсах НАН Беларусі Аляксандра Казуліна, менавіта працяглае і амаль неабмежаванае веснавое паляванне мацней за ўсё «ўдарыла» па папуляцыі гусей. Сёння колькасць шэрых гусей у Беларусі знізілася да 200 пар, і цяпер гэтыя птушкі знаходзяцца на мяжы знікнення.

Сяргей КУРКАЧ.

Абзац

■ На пятай міжнароднай спецыялізаванай выстаўцы «Дзень Расійскага поля-2008», якая адбылася ў Белгародскай вобласці, беларуская сельскагаспадарчая тэхніка ўдастоена сямі залатых медалёў і васьмі дыпломаў Гран-пры. Аснову калектыўнай экспазіцыі Мінпрама, самай вялікай па плошчы, склала сельскагаспадарчая тэхніка «Гомсельмаша», Мінскага трактарнага завода, «Бабруйскагрэмаша», «Амкадора». Свае распрацоўкі прадставілі таксама ВА «БелаўтаМАЗ», «Бабруйскселькаш» і Мінскі маторны завод. За час работы выстаўкі беларускія прадпрыемствы рэалізавалі сельскагаспадарчай тэхнікі на суму больш як 20 млн расійскіх рублёў.

■ **За гандаль людзьмі і звязаныя з ім злачынствы ў Беларусі асуджаныя 1155 чалавек. Аб гэтым учора на семінары ў Мінску паведаміў старшы оперупаўнаважаны па асабліва важных справах 5-га аддзела Ўпраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі крымінальнай міліцыі МУС Беларусі Дзмітрый Цаюн.**

■ Супрацоўнікі Брэсцкай мытні спынілі спробу незаконнага перамяшчэння праз беларуска-польскую мяжу каля 4 тыс. таблетак экстазі. Таблеткі былі выяўленыя ў пункце мытнага афармлення «Варшаўскі мост» пры аглядзе аўтобуса, які ехаў з Германіі ў Расію. Агульная вага таблетак — 1,2 кг, яны знаходзіліся сярод прадуктаў харчавання. Ніхто з пасажыраў не прызнаў груз сваім. На «чорным» рынку кошт такога тавару складае каля 60 тыс. долараў.

■ **П'яны вадзіцель у Мінску насмерць збіў пешахода-пенсіянера. 46-гадовы рабочы аднаго са сталічных ЖЭУ, кіруючы асабістай аўтамашынай, быў п'яны (утрыманне алкаголю ў крыві 3,56 праміле) і не меў пры сабе вадзіцельскага пасведчання і дакументаў на аўтамашыну. На праспекце Пераможцаў ён наехаў на пенсіянера, які пераходзіў праезную частку па рэгулюемым пешаходным пераходзе на забаранёны сігнал святлафора. Ад атрыманых траўмаў пешаход памёр на месцы ДТЗ. Усяго за суткі ў сталіцы выяўлена больш за 840 парушэнняў правілаў дарожнага руху, затрымана 12 вадзіцеляў у нецвярозым стане, 14 — якія не маюць права на кіраванне, спынена 106 парушэнняў хуткаснага рэжыму, 119 пешаходаў прыцягнутыя да адказнасці за парушэнне правілаў пераходу дарогі.**

■ **Арганізатары латарэі ў Фларыдзе вызначылі ў якасці прыза за другое месца бясплатны бензін да канца жыцця. За трэцяе месца паабяцаны бясплатны бензін на год. Прыз можна ўзяць таксама грашыма. За другое месца ён складае 52 тыс. долараў. Паводле меркавання амерыканцаў, пажыццёвы бензін нават больш выгадны, чым першы прыз. Па ацэнцы арганізатараў латарэі, новы варыянт прыза аказаўся вельмі ўдалай ідэяй, паколькі латарэйныя білеты хутка раскупляюцца. Згодна з апытаннем, праведзеным напярэдадні, 90 працэнтаў тых, хто рэгулярна ўдзельнічае ў латарэях, назвалі самым жаданым прызам бясплатны бензін, хоць у якасці магчымага адказу прапаноўвалася і аплата гадавых іпатэчных плацяжоў за дом.**

■ У Пецярбургу мужчыну задавіла раскладной канапай, якая складваецца, якую неспадзявана прывяла ў дзеянне яго жонка. За дзень да смерці мужчына моцна выпіў, а на наступную раніцу адмовіўся ўставаць з канапы. Паміж сукэнцамі завязалася смяешная сварка. Жонка, праходзячы міма канапы, са злосці пхнула яе нагой. Канапа склалася. Мужчына, які ляжаў на ёй, памёр імгненна: магутныя спружыны пераламалі яму хрыбетнік і рэбры. Выратавальнікі і міліцыянеры ўжо не змаглі яму дапамагчы. Вырашаецца пытанне аб узбуджэнні крымінальнай справы супраць жонкі.

Поўны абзац

■ **Жабрачка ў індыйскім горадзе Колката (былая Калькута) здала ў банк тры вядры манет, якія яна накапіла за гады, калі жабравала на гарадскіх вуліцах. Супрацоўнікі банка мяркуюць, што на падлік

ДОМ НАД БЯРЭЗІНАЙ: РЭІНКАРНАЦЫЯ

Падарожнік, які праязджае ці праходзіць мост праз Бярэзіну па шашы Мінск—Магілёў, абавязкова заўважыць шырокі жалезны дах у лістоце галінастых дрэў. Пад гэтым дахам на правым беразе ракі схавалася паўтарастагадовая сядзіба графоў Патоцкіх, адзін з галоўных архітэктурных помнікаў Бярэзіншчыны. Аднак ад былой прыгажосці і пышнасці сёння няма і следу… Запусценне, чорныя дзіркі вокнаў, напаўразбураныя сцены і падлога. Які лёс чакае старадаўнюю сядзібу?..

Гісторыя над Бярэзінай

У сярэдзіне XVIII стагоддзя мястэчка Беразіно належала польскаму каралю Аўгусту III, у канцы ж стагоддзя было ўжо ў складзе Расійскай імперыі. У розныя часы яго гаспадарамі былі Сапегі, Тышкевічы, а ў сярэдзіне XIX стагоддзя яго атрымалі ў валоданне Патоцкія — спачатку шляхецкі, а затым графскі польскі род. У свой час Патоцкім спрыяў канцлер Ян Замойскі, падтрымліваў сяброўства з родам Жыгімонт III. Парадненне ж з малдаўскім гаспадаром Іерэміяй Магілай дадало Патоцкім моцы, аўтарытэту і новых зямель, якія яны мелі ў Беларусі, Польшчы і ва Украіне. Род Патоцкіх да пачатку XVII стагоддзя стаў такім жа разгалінаваным і шляхетным, як і род Радзівілаў.

Прыгожы двухпавярховы палац з цудоўнымі садамі ў некалькі гектараў пабудавала каля 1850 года Ганна Патоцкая-Вансовіч, дачка гетмана ВКЛ Людовіка Тышкевіча. Палац стаў адной з летніх рэзідэнцый. Наступнымі гаспадарамі бярэзінскай сядзібы сталі бацька і сын Маўрыкій і Аўгуст Патоцкія. Гаспадары ў асноўным жылі ў Варшаве, прыязджаючы сюды толькі ўлетку і ўвосень. Аўгуст меў вясёлы нораў, любіў людзей творчых, а таму ў рэзідэнцыі бавіла час ледзь не ўся тагачасная тэатральная і мастацкая багема. Мясцовыя лясы былі поўныя рознага звера ды птушкі, таму тут праходзілі грандыёзныя паляванні. Ёсць сведчанні, што некалі ў бярэзінскіх лясах палявалі нават асобы расійскага імператарскага двара.

Пасля рэвалюцыі велізарны сад стаў калгасным, а ў гістарычным будынку зрабілі дзіцячы дом, які ў 1928 годзе ператварылі ў сямігадовую школу, а праз дзесяць гадоў — і ў сярэднюю. Вучыліся тут дзеці і пасля Вялікай Айчыннай вайны. А ў сямідзесятых гадах у былых графскіх пакоях размясціўся склад. Пасля сядзібу і напаткаў трагічны лёс — літаральна за два дзесяцігоддзі яна згубіла прыстойны выгляд. Засталася ад яе хіба што трэцяя частка. Нават каменныя прыступкі, якія калісьці збягалі з абрыву да самай ракі, зніклі шмат гадоў таму. Прыблізна да пачатку 80-х гадоў яшчэ можна было ўбачыць рэшткі графскіх стайняў з чырвонай цэглы. Ад шыкоўнага саду дзе-нідзе засталіся адзінокія дрэўцы. З набыццём выгляду «дома з прывідамі» сядзіба ўзбагацілася легендамі: пачалі гаварыць, што ў скляпеннях можна знайсці скарб, а пад самой сядзібай знаходзіцца патаемны ход на другі бераг ракі.

Сучасны выгляд помніка выклікае жаль. Сёння ён стаў месцам збору не самых культурных людзей — аб гэтым сведчаць горы смецця, пустых бутэлек і безліч розных надпісаў на сценах, пачынаючы ад прызнанняў у каханні і заканчваючы сатанінскай сімволікай…

Чаканне над Бярэзінай

У свой час будынак збіралася рэстаўраваць спачатку навуковавытворчае аб'яднанне «Цэнтр», затым — «Будінвест», але сродкаў хапіла толькі на замену даху, які сёння і бачны з моста цераз Бярэзіну. Як часта бывае ў такіх гісторыях, за мяжой знайшліся нашчадкі Патоцкіх. Яны прасілі вярнуць ім дом на рамонт і рэстаўрацыю, аднак атрымалі ад раённых улад адмову.

Як высветлілася, у райвыканкаме ўжо даўно былі агучаныя ідэі аднаўлення і эксплуатацыі гістарычнага будынка: па адной з іх прапаноўвалася зрабіць у памяшканнях музей Бярэзінскага краю, па другой — палац шлюбаў. Узнікала прапанова адкрыць новую гасцініцу… Аднак усе ідэі заставаліся вісець у паветры.

— У адпаведнасці з заканадаўствам аб ахове помнікаў мы не можам пачаць рамонт без дазволу вышэйстаячых органаў, — засмучаўся ў адной з размоў Канстанцін Ермакоў, начальнік аддзела культуры райвыканкама. — Амаль штогод мы адпраўляем заяўку на рэстаўрацыю помніка архітэктуры, аднак кожны раз нас просяць пачакаць у сувязі з недахопам фінансавання. І мы чакаем, бо, па-першае, на рэстаўрацыю помніка не хопіць усяго гадавога бюджэту аддзела культуры, а па-другое, за парушэнне заканадаўства аб ахове помнікаў і самавольны пачатак рамонтных работ нас чакае велізарны штраф. Некалькі разоў мы спрабавалі вывесці сядзібу са спісу помнікаў, бо, пагадзіцеся, сярэдзіна XIX стагоддзя — гэта не такая ўжо даўніна. Гэта дало б нам магчымасць пачаць хоць бы невялікія аднаўленчыя работы. Аднак, на жаль, знаць статус помніка не атрымалася…

Сучаснасць над Бярэзінай

Удалае рашэнне было знойдзена ў пачатку гэтага года: помнік перавялі на баланс аддзела фізічнай культуры, спорту і турызму.

Сёння аддзелам ужо заключаны дагавор з адной са сталічных фірмаў на абследаванне будынка і зямлі, на якой ён стаіць. На падставе гэтага абследавання будзе вынесенае заключэнне аб стане помніка і нададзены яму пэўны клас. І ў залежнасці ад класа, а значыць і неабходнай сумы, узгодненай з Упраўленнем фізічнай культуры, спорту і турызму, будуць вызначаныя крыніцы фінансавання. Пасля распрацоўкі праектнакаштарыснай дакументацыі пачнецца знешняя рэстаўрацыя і ўнутраная рэканструкцыя будынка. На пытанне «калі?» у аддзеле ўпэўнена адказалі: «У канцы жніўня — пачатку верасня».

Дык што ж, у рэшце рэшт, з'явіцца ў былой сядзібе Патоцкіх? Тут будзе прымаць падарожнікаў і гасцей горада турыстычная гасцініца. А водны канал, які знаходзіцца акурат перад будучай гасцініцай, будзе ператвораны ў веславы канал з невялікай лодачнай станцыяй.

Нарэшце архітэктурны помнік пасля дзесяцігоддзяў чакання атрымаў права на новае жыццё. Хутка ён «перародзіцца» ў галоўны турыстычны пункт на карце Бярэзінскага раёна. Доўгачаканая «рэінкарнацыя»…

Таццяна ДАНІЛУШКІНА.
Фота аўтара.

КАБ НЕ ТОЕ «ЗДРАСТУЙЦЕ!»

Мой бацька быў рэдкім гумарыстам: дня, лічы, не праходзіла, каб ён нешта не «змарозіў». Для пачатку — толькі два эпізоды. Першы.

Некалі ў нашай вёсцы была цагельня, людзей там працавала шмат, бо хоць нейкую капейку рабочым ды плацілі… Да таго ж на тэрыторыі — свой ларок. Хлеб у ім (тады — кукурузны), сваім, можна сказаць, без чаргі прадаваўся. Не тое што ў мясцовым сельмагу…

Дык вось. Адзін з мужыкоў адпрацаваў сваю змену, набраў цэлае бярэмя хлеба і нясе. Бацька ж — яму насустрач, на работу ідзе. Кажа, параўняўшыся:

— Ну і нагрузіўся ты, брат! Глядзі, ці данясеш?

— Ды не кажы, — зганджаецца мужык. — Нават во засмаліць не магу — абедзве рукі занятыя.

— То на, закуры, — спагадае бацька, распальвае цыгарку і ў губы яму.

А заадно пытае:

— А дзе ж гэта рэмень твой?.. Падвязваўся во нейкай вяроўчынай.

І далікатна так за кончык яе. Вузел хоп і развязаўся. Порткі ў чалавека — адпаведна ўніз…

Падхапіць бы — рукі занятыя: хлеб на дарогу (ды пасля дажджу) ніяк не пакладзеш… Закрычаў як рэзаны:

— Э-э, што ты робіш?!

— А во — на работу пазнюся, — патлумачыў бацька. — Бабы, фармоўшчыцы, бач, даганяюць.

З гэтымі словамі ён заспяшаўся далей. Але, зразумела ж, бачыў, як урачыста (на фоне шэрага дня) бялелі мужыковы споднікі, як дзве спагадлівыя кабеты падцягвалі небараку штаны і падвязвалі іх аборай, як астатнія жанчыны лажыліся ад смеху.

— Ну не дрыжы так, — спрабавалі суцяшаць мужыка, — данясеш дамоў сваё багацце…

(Меўся на ўвазе, відаць, не толькі хлеб).

…У другі раз вечарам маці пайшла ў хлеў карову даіць. Бацька сядзеў ля акна, адпачываў. Потым падхапіўся, падышоў да вешалкі, накінуў хустку, праз ногі ўсцягнуў спадніцу і зноў прысеў на ўслон.

У хату з вядром сыродою зайшла маці. Убачыўшы «незнаёмку», сказала ёй «Здрастуйце!» і ў паўзмроку (летам лямпу рэдка запальвалі) стала ўважліва ўглядацца, а каму ж гэта?… Бацька не вытрымаў — зарагатаў.

— Ну і чаго ты?.. Я ж цябе адразу пазнала, — спрабавала апраўдацца маці.

— А чаму ж здароўкалася? — пытаў яе бацька.

Крыць не было чым.

Мікола Камароўскі,
г. Орша

ТОНКІ НАМЁК

…Мо помніце: гадоў 15—20 назад «у моду» ўвайшлі жукі-павукі велічынёй з курынае яйка — чорныя такія, страшныя? Іх яшчэ завесці можна было. Каб папаўзлі…

Хлопцы-школьнікі вельмі любілі іх пад парты пускаць. Дзяўчынкам… Во дзе піску было!.. А ўжо смеху… Сама не раз чула.

Але ж зараз гаворка не пра школу. Па панядзелках у адным з райаддзелаў міліцыі «пяцімінутка» праходзіла. Праводзіў яе сам начальнік: аналізаваў злачыннасць (хто што ўкраў, хто каго пабіў, колькі ДТЗ, ахвяраў…), ацэньваў работу кадраў. Яны, гэтыя кадры — пераважна мужчыны, досыць сталага веку, сур'ёзныя, у форме — унурыўшыся сядзелі, як быццам слухалі… Хоць у той дзень гэта і цяжка было, бо дужа ж збрыдзела. Сён-той драмаць стаў, сён-той — крадком газету чытаць, а нехта… дзяцінства ўспомніў. Гэта значыць, дастаў з кішэні (мо ў каго з малых адабраў?) вось такога павука, накруціў, пусціў на падлогу, а інспектарцы па справах няпоўнагадовых шапнуў:

— Казіміраўна, пад ногі глянь.

Тая паслухмяна так зірк і… у піск… І з нагамі на крэсла!.. Ну як некалі ў школе.

…Злачынцу-павука, які так напалохаў кабету, калегі ўмомант злавілі. А пасля гэтага і «пяцімінутка» скончылася — намёк дужа тонкі быў.

Алена Саўко,
в. Рэпля, Ваўкавыскі раён

ТАНЕЦ ПАСТУХА

У некага дзень пачынаецца са шклянкі гарбаты, у некага — з кубачка кавы, у аднаго з маіх знаёмцаў — не паверыце — з трох літраў малака.

Працаваў, значыць, гэты знаёмец пастухом у калгасе. Статак ведаў, як свае пяць пальцаў, даярак — таксама. Вось з адной акурацістай і дамовіўся, каб тры літры самага тлустага сыродаю яна што-раніцы пакідала ў вядрэ, пад цадзілачкай. Ён прыходзіў, садзіўся… І тады, здавалася, хай каровіне гарыць і за карак галавешкі валяцца, — не здрыганецца ён, малако будзе піць. Галоўнае — доўга, пакрысе…

Яму — асалода, а «калегам па цэху» — той сыродай як костка ў горле. Трэба ж кароў выганяць, працаваць, а ён… Прасілі — нуль увагі, сварыліся — не зважаў…

Таму аднойчы рашылі мужыкі жарт «састроіць»: выпрасілі ў ветэрынара касторкі, крадком плюхнулі ў тое малако, размуцілі ў два пугаўі, даёначку цадзілкай накрылі і паставілі — усё, маўляў, вось і зажды…

Прыйшоў іх сябрук раніцой на працу, сеў, нічога не прыкмеціўшы, узяў на калені «кактэйль» і нават вухам не павёў — выжлукціў…

Да статка дайсці не паспеў, — прысеў… Раз, другі, трэці…

Пасля пятага порткі больш не падцягваў, а на ўсялякі выпадак зусім іх зняў. Сам — плашч апрануў (сіноптыкі якраз дождж абяцалі)… І ўпрысядку, перад каровамі.

Каровы — глядзелі. І нават з цікаўнасцю. Адно — пераважна здалёк. «Музыкі», мусіць, баяліся.

А мужыкі спагадалі. Казалі:

— Бач ты, якая каварная штука гэты сыродай: сто дзён п'еш — нічога, а на сто першы на табе — такое атручэнне выйшла.

Як бы там ні было, але ж ад ранішніх трох літраў сыродаю пастух адмовіўся.

Што, уласна, і патрабавалася.

С.Б.,
г. Масты

ПЛЮХНУЦЦА, КАБ АКУНУЦЦА

Актуальна: летам 1951 года мы здавалі экзамены — паступалі ў самую прэстыжную ВНУ, у Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт.

Тыя, каму (у розныя часы) пашчасціла гэта зрабіць, ну напэўна ж, помняць першыя ўражанні — пах друкарскай фарбы на новенькіх залікоўках, урачыстае пасвячэнне ў студэнты…

Нас, усіх першакурснікаў, сабралі тады на вялікі сход. Выступаў на ім рэктар, добрыя словы гаварылі масцітыя выкладчыкі…

— Хто яшчэ жадае сказаць? — спытаў нарэшце вядучы.

— Я, — падхапіўся з месца наш аднагрупнік Косця.

Мы, уражаныя яго смеласцю, сталі дыханне, навастрылі слых… А Косця ўжо смела ішоў да трыбуны і адтуль у хуткасці зазвінела яго ўрачыстае:

— Таварышы! Я сёння адчуваю сябе самым шчаслівым — збылася мая запаветная мара: я-такі плюхнуўся ў стыхію студэнцкага жыцця…

Прадоўжыць выступоўцу не далі — зала ўзарвалася смехам. Рагаталі ўсе — і першакурснікі, і пасівелыя прафесары. « Што значыць філолаг! — гаварылі яны адзін аднаму. — Як сказануў…»

Прычыну смеху Кастусь падсек не адразу, але ж, калі дайшло, засмяяўся і сам.

…Цішыня ў зале запанавала толькі тады, калі патухла святло і на экране з'явіліся першыя цітры фільма «Сельская настаўніца».

Віктар Несцяровіч,
г. Лагойск

ЗАГНУЦЦА? НЕ ТРЭБА

Мой сваяк у канцы мінулага стагоддзя служыў у арміі, меў там добрых сяброў. І (як цяпер помню) лічыў, што гэта — «на векі вечныя», што яны заўсёды будуць прыязджаць да яго, а ён — да іх. Але ж чалавек, як вядома, думае гэтак, а ў жыцці выходзіць… І так, і не так: брат ажаніўся, дзеці пайшлі. У сяброў — відавочна, таксама…

Карацей — гадоў з дзесяць нікога са сваіх ён не бачыў. І тут, раптам, на вуліцы…

Радасці, казаў, проста межаў не было: Колька, саслужывец!

Пасля абдымкаў, як водзіцца, пайшлі ў рэстаран, пасядзелі там, выпілі. Бо было за што: Колька — ніякі не Колька ўжо, а Мікалай Фёдаравіч (імя зменена) — завочна ўніверсітэт скончыў, журналіст, усю краіну аб'ехаў. Сваяк таксама не лыкам шыты: дом, лічы, дабудаваў, дзяці, фірма свая. Не сказаць каб вялікая (на той час — два пакойчыкі ў КБА), але ж галоўнае — ёсць пачатак.

Паехалі туды, паглядзелі… Само сабой — дабавілі… Там жа. Госць, глядзіш, і ацяжэў (за дзень, потым прызнаўся, макавай расінкі ў роце не было). А брату што рабіць? Папрабаваў падняць яго, каб у гасцініцу завезці — марна: той на галаву вышэйшы. Прасіць некага, каб дапамог, няёмка ды і позна ўжо. Рашыў — нічога страшнага, жонка не чакае, дзеці не плачуць, колькі той ночы, на канапцы паспіць…

Што далей было, камандзіровачны ўжо сам раскажваў. Значыць, ачуняў ён, як быццам, пад раніцу, але «нежывы». Цішыня вакол — проста мёртвая. І… вянкі. Першы — ля самага твару: вялізазны, яркі… І надпіс на ленце: «…ад любячай жонкі». Во, падумаў, трэба было загнуцца, каб ты хоць штось зразумела, каб людскае слова сказала, а то толькі «грошы давай»… Побач на ленце: «Дарагому татачку…». І да гэтых, бач, таксама нешта дайшло, а то ўперад толькі «Тата, трэба», «Татка, купі…».

З другога боку таксама вянкі. Прыгожы з лентай «Дарагому сябру…». Малайцы, хлопцы — скінуліся. Яшчэ прыгажэйшы — «…Ад калектыву музычнай школы». Ён быў там… Харошы артыкул выдаў! Інтэлігентныя людзі, бач, ацанілі… Іншыя і не пазвоняць… Побач з ім — «…ад праўлення калгаса…»? Дзіўна: гэтых — крытыкаваў… А, бач, не пакрыўдзіліся, таксама вянок купілі.

А дзе ж, думае, ад рэдакцыі? Усе стужкі перагледзеў — няма. «Вось табе і на: стараўся, па камандзіроўках гойсаў, а бач — эканомілі, нават нейкай убогай карзінкі і то не купілі…

І так яму ад гэтага крыўдна стала, так балюча, што за сэрца хапіўся…

Адчуў — баліць. Ага, думае, нешта не так? Яшчэ класік пісаў, што мёртвым — яно не павінна?… Выходзіць, жывы?!.

…Сумненні развеяў сваяк, які, лічы, у той жа момант прыбег на працу. Ён і сказаў, каму гэтыя вянкі падрыхтаваны.

А ім — яшчэ рана.

С. Маркевіч,
г. Віцебск
Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

Шэсць не дзесяць…

Кватэрнае пытанне

У сістэме ЖКГ я адпрацавала пяць гадоў (летась звольнілася), муж — шэсць, атрымалі службовую кватэру. Ці застанецца яна за намі, калі звольніцца і ён?

І. Карнеева.

Дагавор найму жылога памяшкання дзяржаўнага жыллёвага фонду з'яўляецца тэрміновым і падлягае спыненню (скасаванню) у сувязі са стратай падстаў для пражывання ў службовым жылым памяшканні.

У адпаведнасці з заканадаўствам работнікі, якія спынілі працоўныя (службовыя) адносіны з арганізацыяй, у гаспадарчым карыстанні або аператыўным кіраванні якіх знаходзяцца службовыя жылыя памяшканні дзяржаўнага жыллёвага фонду, падлягаюць высяленню са службовага жылога памяшкання з усімі грамадзянамі, што пражываюць з імі, у судовым парадку.

Артыкулам 96 Жыллёвага кодэкса Рэспублікі Беларусь прадугледжаны канкрэтныя выпадкі, калі грамадзяне не высяляюцца са службовага жылля без выдзялення ім іншых жылых памяшканняў. Да такіх грамадзян аднесены і асобы, якія адпрацавалі на прадпрыемстве, ва ўстанове, арганізацыі, што выдзялілі ім службовае жылое памяшканне, не менш за дзесяць гадоў.

Пры гэтым улічваецца стаж работы толькі найманыка службовага жылога памяшкання, г.зн. таго работніка, якому яно было выдзелена ў сувязі з характарам працоўных адносінаў. Заканадаўства, што дзейнічае, не ўтрымлівае нормаў, якія прадугледжваюць улік перыяду работы членаў сям'і наймальніка ў арганізацыі, якая выдзеліла службовае памяшканне. Значыць, грамадзяне (наймальнікі службовых жылых памяшканняў), якія не адпрацавалі ўстаноўленыя дзесяць гадоў у арганізацыі, што выдзеліла ім службовае жыллё, не адносяцца да катэгорыі тых, хто не падлягае высяленню без выдзялення іншага жылля.

Віктар САВІЦКІ.

Малы бізнэс на «базары»

Выстава-кірмаш, дзе будзе прадстаўлена прадукцыя прадпрыемстваў малога бізнэсу, адкрыецца на міжнародным фестывалі мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» прама побач з ягоным сэрцам — Летнім амфітэатрам.

У спецыяльным павільёне плошчай 500 квадратных метраў фірмы з Беларусі і Расіі не толькі прапануюць гараджанам і гасцям «базару» набыць свае вырабы. Тут будуць праводзіцца дзелавыя сустрэчы, абмяркоўвацца бізнэс-прапановы. Арганізатары ўжо маюць багаты вопыт правядзення такіх кірмашоў. У мінулыя гады яны спрыялі стварэнню сумесных прадпрыемстваў і развіццю экспартнага патэнцыялу айчынных вытворцаў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Праваліўся на фальшыўках

Размова пра жыхара вёскі Свідаўка Гомельскага раёна 1979 года нараджэння, які быў чатыры разы судзімы. Зайшоўшы ў адзін з магазінаў абласнога цэнтра з мэтай купіць прадукты харчавання, ён разлічыўся за іх фальшывай 50-тысячнай купюрай. Але не тут тое было: прадаўшчыца праявіла пільнасць. У затрыманага знайшлі яшчэ 31 такую ж купюру. Узбуджана крымінальная справа.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Нефармат

КУЛЬТУРА Ў ЗАКОНЕ

Некалі паэт напісаў на сябе жартоўную эпітафію: «Ён кінуў піць, бо спіць». А вось кінуць курыць, акрамя вечнага сну, чалавека можа прымусіць наяўнасць занятку на аўтобусным прыпынку, паводле нататак мастака Адама Глобуса. І я адразу ж уявіла, як незнаёмы мне візажыст Пятроў борздзенька падмятае тэрыторыю прыпынка і збірае ў кошык недакуркі, што накідалі яго таварышы па прывычцы. А што, гэта добры занятак і, галоўнае, карысны для ўсяго грамадства. Бо да-ста-лі! Курцы на аўтобусных прыпынках. Кожны дзень адна і тая ж карціна. Стаіш на прыпынку, выглядаеш свой аўтобус ці тралейбус, а два-тры чалавекі пасяроду натоўпу смаляць прама ў твары астатнім. Калі дождж, яны абавязкова стаяць пад казырком, калі спёка — яны ў цяньку.

Гаварыць з імі амаль бессэнсоўна, на заўвагу зрэагуе адзін з дзесяці. Прыкра, вядома, што пры ўсім нашым імкненні пачуваць сябе еўрапейцамі, суайчыннікам у вялікіх гарадах не стае элементарнай чалавечай культуры, звычайнай людскасці. Іншы кватэру абсталяваў па-еўрапейску, машыну шыкоўную прыдбаў, а вось не даў рады ўцяміць, што правіла добрага тону цывілізаванага чалавека вымушае не перашкаджаць жыць іншым. І выходзіць, як у Коласа: «Франт салам боты вымазаў, а скурку з'еў». Але што нам у рэшце рэшт да недахопаў выхавання некага? Нам трэба, каб нас адгарадзілі ад тых, хто травіць нас без нашай на тое згоды.

І ў Еўропе, і ў Амерыцы гэта робіць закон. Там даўно прыняты заканадаўчыя акты, якія забараняюць курэнне ў грамадскіх месцах, у месцах масавага знаходжання людзей, у тым ліку на прыпынках. У многіх краінах і вакзалы, і розныя ўстановы абсталяваныя месцамі для курэння, і выйсці за іх межы нельга ні ў якім разе. А закон парушыў — заплаціш столькі, што ў другі раз наўрад ці захочаш. Можна ўвесці, лічу, як альтэрнатыўную службу, альтэрнатыўны штраф у выглядзе работ па прывядзенні ў парадак роднага горада. Карысна і для грамады — чыстыя вуліцы, і для сябе — работа на свежым паветры.

А калі сур'ёзна, то занадта лаяльнае ў нас заканадаўства да тых, хто не толькі перашкаджае жыць, але і пагражае жыццю і здароўю іншых. Колькі ў нас пішацца і гаворыцца пра розныя прытоны, кватэры, гаспадары якіх вядуць асацыяльны лад жыцця. А дзейсных рычагоў заканадаўства, якія абаранялі б нас ад такога суседства, няма. Жыхары аднаго са шматкватэрных дамоў пасёлка Высокалітоўск Камянецкага раёна закідалі лістамі раённыя інстанцыі. Яны баяцца за сваё жыццё. У доме адна кватэра даўно ператворана ў неспрасветны п'яны прытон. Ім даўно адключылі электрычнасць і газ за неаплату. Але ж яны гатуюць, асвятляюць, бывае, абагравающь жытло нейкімі прыстасаваннямі. А гэта стварае павышаную небяспеку. Адгарадзіць жа добрасумленных людзей ад гэтага кашмару няма ніякай магчымасці. Колькі гадоў назіраю падобнае ў сваім уласным доме. На сёмым паверсе стары спіты гаспадар аднапакаёвай кватэры пастаянна дае прытулак наркаманам, тут яны варыць нейкае смярдзючае зелле. Міліцыя прыязджае часта, здараецца, забіраюць дзеда ў аддзяленне, былі суды. Але праходзіць час, і ўсё паўтараецца. У ліфце зноў сустракаю асобаў са страшным у свайі пустаце поглядам, узрост іх вызначыць нават прыблізна немагчыма, у лахманах з вялікімі сумкамі — Пятровіча кліенты.

Раней падобныя з'явы, калі і здараліся, не афішавалі, але ціха разбіраліся з парушальнікамі грамадскай маралі. Таму і не стваралі законаў. А цяпер ціха нельга, а законы ўсё роўна стварыць не адважваемся. Саромеемся, відаць, мяркуем, што лепш перацярпець, можа, само ўляжацца, ператрасецца. А перацярпець — гэта як хваробу загнаць углыб.

Па маім глыбокім перакананні, не будзе сапраўднага парадку вакол дарог, у лясах, у населеных пунктах, пакуль не будзе жорсткіх мераў рэагавання да парушальнікаў. Цяпер многія ездзяць у Заходняю Еўропу, раказваюць, што там, калі часам выкінеш з акна машыны пластыкавую бутэльку ці ўпакоўку, вялікі штраф, лічы, гарантаваны. Там нікому не прыйдзе ў галаву пакінуць кучу смецця ля дарогі. Можна лаяць за стыхійныя звалкі старшынь сельскіх Саветаў на ўсіх нарадах, можна патрабаваць ад іх прыбіраць тэрыторыю ўласнаручна, праблему гэта не вырашыць. Прыгарадныя лясы рэгулярна прыбіраюць. Але чысцейшымі яны, на жаль, не становяцца…

…У суседзяў — госці. Сваякі прыехалі з Канады. Былым брастаўчанам, ім захацелася прайсціся па месцах маладосці, там, дзе некалі ладзілі пікнікі за паўднёвым мікрараёнам, дзе купаліся ў маленькіх азярцах. Свае ж людзі, тутэйшыя, проста паехалі два дзесяткі гадоў таму, а было няёмка суседцы пасля прагулкі. Так яна расказвала пра свой паход з гасцямі па маршруце іх выпускнога вечара: кругом машыны з адпачываючымі, кругом смецце. Яшчэ, між іншым, канадскія брастаўчане расказвалі пра такі момант узаемаадносінаў са сваімі суседзямі. Калі ў цябе запрошаны госці, ты павінен абысці ўсіх суседзяў па пляцоўцы і спытаць, ці не будуць яны адпачываць, напрыклад, у 19 або 20 гадзін, калі ў цябе можа ігрець музыка. І гэта як элемент культуры. Інакш проста не бывае. Бо калі так не зрабіць, і нехта паскардзіцца паліцэйскаму, можна нарвацца на вялікія непрыемнасці.

«Культуру трэба выхоўваць культурай», — гаварыў адзін з былых міністраў культуры нашай дзяржавы. Залатыя словы. Выхоўваць — сапраўды, а вось усталёўваць культуру без падтрымкі закона вельмі цяжка.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Крынічка
«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.
Рубрыку вядзе Валянціна ШПІЛЕЎСКАЯ, тэл. 285 88 81
№ 19 (270)

Ці ведаеце вы, што…

● У агрэсту пладовыя пупышкі (змешанага тыпу) закладваюцца на аднагадовых прыростах і пладаносяць 3—4 гады, таму галінкі, старэйшыя за 5—6 гадоў, малапрадуктыўныя. Ягады выспяваюць праз 50—60 дзён пасля цвіцення. Агрэст — самаплодная расліна, але лепш, калі кветкі апыляюцца пыльцой з іншых кустоў.

● На шчыльных гліністых глебах абляпіха расце дрэнна, але добра развіваецца на рыхлых супясчаных і пясчаных. Лепшы тэрмін пасадкі — ранняя вясна. Пры любым спосабе пасадкі садзянцы заглыбляюцца на 10—15 см ніжэй, чым каранёвая шыйка. Садзяць строга вертыкальна, каб пазбегнуць ваўкоўкаў парасткаў.

Работы на агародзе ў другой палове лета

Лета ў разгары, агарод радуе вока гаспадара. Зеляніва і маладыя карэнеплоды агародніку выкарыстоўваюць у ежу, тым самым папаўняючы запас вітамінаў, жыццёва неабходных для чалавека. Сярод зеляніва папулярны не толькі кроп і пятрушка, але і базілік, шалфей, мята і інш. Самыя карысныя парасткі і плады — сарваныя раніцай, калі яны яшчэ ў расе.

У **бульбы** — час, калі клубні набіраюць масу, таму бульбоўніку патрэбна святло. Калі месцамі выяўляецца моцнае загушэнне, то карысна ўручную размеркаваць бульбоўнік раўнамерна. Пры такой працэдуры, а таксама ў час паліву і збору каларадскага жука пазбягаюць пашкоджання лістоў. Калі ж бульбоўнік пажухне, можна ўжо не паліваць, таму што рост клубняў спыніўся.

У **агуркоў**, наадварот, трэба падтрымліваць узмоцнены рост плецяў, шчодра паліваючы і падкормліваючы расліны аж да канца лета.

На тых раслінах **кабачкоў**, **патысонаў** ці **гарбузоў**, на якіх спеюць плады на зімняе захоўванне, даводзьце іх да патрэбнага памеру, выдаляйце завязі, якія нанава адрастаюць на плеці. Ва ўмовах нашага кароткага лета на кожнай плеці можа выспець толькі адзін плод гарбуза.

У **таматаў** працягвайце выдаляць пасынкі, а з пачатку жніўня і кропкі росту разам з кветкамі, накіроўваючы ўсе сілы расліны на выспяванне пладоў, якія ўжо завязаліся. У адкрытым грунце ў гэты час у памідораў можна абрываць не толькі кветкі, але і лісты — гэта прымусіць расліну ўсе сілы аддаваць выспяванню пладоў, палепшыць праграванне глебы. У халодныя ночы існуе пагроза ўзнікнення фітафторы, таму зменшыце дозу паліву таматаў і бульбы і ўстрымайцеся таксама ад падкормак нават фосфарна-калійнымі ўгнаеннямі.

У хуткім часе, пасля паляган-ня лістоў, гатова да ўборкі цыбуля. Не забудзьцеся прасушыць цыбуліны.

Не спазніцеся з уборкай **часнаку**: пераспелыя часначыны ўжо ў зямлі рассыпаюцца на долькі.

Усе віды капусты абараняйце ад вусеняў, шчодра паліваючы, правядзіце некалькі падкормак перагнойнымі настоямі.

У жніўні пасейце **шчаўе**, **сельдэрэй**, **пятрушку**, каб атрымаць зяленіва на наступны год: гэтыя расліны пойдуць пад зіму зусім маленькія, затое вясной, калі ўсе толькі збяруцца іх сеяць, у вас ужо будуць «салідныя» расліны.

Пасейце жыта на градках

На невялікіх прысядзібных участках застаецца праблема вядзення разумнага севазвароту. Бульба садзіцца пасля бульбы, гарбузовыя культуры — пасля гарбузовых, назапашваюцца ў зямлі шкоднікі, узбуджальнікі хвароб. Таму для разрыву гэтага ланцужка прапануецца высяваць сідэратныя культуры. У якасці такіх культур прапануецца жыта азімае, гарчыца белая, рэдзька маслічная, віка.

Цяжка пераацаніць вартасці жыта азімага. Яно перамагае 75—80 працэнтаў розных відаў пустазелля, аднаўляе структуру глебы, абараняючы яе ад усіх відаў эрозіі. Гэта лепшы папярэднік для большасці агародных культур і перш за ўсё бульбы. Высяваць жыта трэба не свежым насеннем, а папярэднягадашнім, прычым як мага раней, адразу пасля расліны-папярэднікі (бульбы ці ранняй агародніны). У нашых кліматычных умовах гэта канец ліпеня — пачатак жніўня.

Беражыце божую кароўку



Сярод мноства насякомых з атрада жукоў божыя кароўкі, бадай, найбольш вядомыя і прыкметныя. Яны могуць быць і жоўтымі з чорнымі кропкамі, і чорныя з чырвонымі або аранжавымі плямкамі, і чырвоныя з чорнымі кропкамі. У свеце іх каля 3 тысяч відаў.

Найбольш вядомая сямікропкавая кароўка — грозны знішчальнік тлі, якая паядае таксама яйкі і лічынкі каларадскага жука. Сама яна можа з'есці некалькі дзесяткаў тлі за дзень, а яе шустрая лічынка ў час свайго развіцця з'ядае не менш як 1000 дарослых гэтых шкоднікаў або 3000 іх лічынак.

Садаводы ведаюць, што божыя кароўкі карысныя, і не знішчаюць іх. Божыя кароўкі адкладваюць яйкі часта на раслінах сярод калоній тлі, павуцінных кляшчоў невялікімі групамі (па 10—30 шт). Лічынкі вылуплваюцца прыкладна праз тыдзень. Яны з жоўтымі ці аранжавымі плямамі, але вельмі рухомыя і ў пошуках ежы перадольваюць вялікія адлегласці. Пасля некалькіх лінек, праз 1—2 месяцы, лічынка акуліваецца, і ўжо праз 6—9 дзён з'яўляецца дарослая асобіна.

Акуліваюцца божыя кароўкі звычайна на лістах, там, дзе харчуюцца. Кукалка жука чырванавата-аранжавага колеру з цёмнымі плямкамі і знешне нагадвае лічынку каларадскага жука. З-за гэтага падабенства аграроднікі часта знішчаюць кукалак божай кароўкі. А зімуюць яны дзе-небудзь у сціплых месцах, часта вялікімі групамі.

У многіх народаў божыя кароўкі выклікаюць сімпатыю. Напрыклад, немцы верылі, што гэтыя жучкі — дзеці багіні даджу, сонца і ўрадлівасці Фрэі. Чэхі лічылі, што знайсці божую кароўку на дарозе — добрая прымета, а французы былі перакананыя, што амулет з выявай такога жука засцерагае дзяцей ад няшчасцяў. У старажытных славян нават існаваў культ божай кароўкі як увасабленне багіні сонца, якая дорыць святло, ураджай, жыццё.

«Кароль» сярод вострапахучых раслін

Базілік сярод вострых прыпраў лічыцца «каралём». Яго водар, у залежнасці ад разнавіднасці, штосьці сярэдняе паміж водарам гваздзікі, лаўровага лісту, анісу, ментолу і духмянага перцу. Радзіма базіліка — Іран, Сірыя. У Еўропу ён трапіў толькі ў XVI ст. Прыправа была вядомая і карысталася папулярнасцю яшчэ ў Старажытнай Грэцыі, а ў Індыі лічылася свяшчэннай травой. Паводле паданняў, гэтая расліна была сімвалам неўміручасці, кахання, сямейнага дабрабыту. Пасеяўшы яго насенне, вы атрымаеце прыгожую клумбу, лякарства, вострую прыправу і пазбавіцеся ад насякомых.

Са старажытных часоў добра знаёмыя лекавыя ўласцівасці базілі

Фестывалім

Гаворыць і паказвае... «Славянскі базар у Віцебску»

Каго, дзе, калі ўбачым на экранах

У перыяд з 11 да 18 ліпеня XVII Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар» стане галоўнай культурнай падзеяй у жыцці не толькі фестывальнай сталіцы — Віцебска, але і Мінска. Але ў апошнім выпадку — у выглядзе прамых трансляцый, спецыяльных уключэнняў і выпускаў навін.

Як і ва ўсе мінулыя гады, адным з арганізатараў і галоўным тэле- і радыёаглядальнікам мастацкага форуму выступае Белтэлерадыёкампанія. Таму ў эфір Першага канала, каналаў «ЛАД» і «Беларусь-ТБ», Першага нацыянальнага канала Беларускага радыё і канала «Культура», радыёстанцый «Беларусь», «Сталіца» і «Радыус-FM», як заўжды, трапіць самая поўная інфармацыя пра падзеі, удзельнікаў і гасцей фестывалю.

Так, са студыі тэлерадыёкампаніі «Віцебск» будуць гучаць гэтым часам знаёмыя пазыўныя праграмы «Добрай раніцы, Беларусь!». Пра самыя цікавыя падзеі распавядзе «Дзённік Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску», які будзе выходзіць на Першым канале чатыры разы на дзень: тройчы — кароткія аператыўныя выпускі, і адзін выніковы, пашыраны — у вячэрнім эфіры.

МУЗЫКА ПА ГРАФІКУ

Па традыцыі, асноўныя мерапрыемствы і начныя канцэрты фестывалю Белтэлерадыёкампанія запіша для далейшага выкарыстання ва ўласным эфіры і для абмену з замежнымі партнёрамі. Напрыклад, будуць запісаныя юбілейны вечар Ігара Лучанка «Беспакойнае сэрца», канцэрт «Маскоўская афіша», выступленне рок-гуртоў «Горад 312» і «Токіо», канцэртныя праграмы «Радыё «Шансон» і «Танцуй да раніцы», а таксама сольны канцэрт Барыса Маісеева «Канцэрт на біс». Конкурс маладых выканаўцаў і дзіцячы музычны конкурс «Віцебск-2008», а таксама шэраг іншых канцэртаў гледачы ўбачаць у прамым эфіры.

КАЛІ І ДЗЕ	КАГО ЧАКАЦЬ
11 ліпеня, пятніца, 21.00	Урачыстае адкрыццё XVII Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». Сярод удзельнікаў канцэрта — Ірына Дарафеева, Анатоль Ярмоленка і ансамбль «Сябры», Пётр Елфімаў, беларускі дзяржаўны ансамбль «Песняры», Дзмітрый Калдун, Тамара Гвердцытэлі, Іосіф Кабзон, Аляксандра Пахмутава, Мікалай Баскаў, Максім Галкін, Лайма Вайкуле, Дзіма Білан, Ані Лорак, а таксама артысты з Арменіі, Венесуэлы, Грэцыі, Егіпта, Турцыі, Кітая, Францыі, ПАР.
12 ліпеня, субота, 15.00	Міжнародны дзіцячы конкурс «Віцебск-2008», дзень першы. Беларусь на конкурсе прадставіць 11-гадовы мінчанін **Раман Валазнёў,** які вучыцца ў дзіцячай студыі арт-гурта «Беларусы» пад кіраўніцтвам Валерыя Шмата, і 11-гадовая Аліна Молаш з Івацэвічаў (педагог юнай спявачкі — мастацкі кіраўнік Нацыянальнага цэнтра музычнага мастацтва імя У. Мулявіна Святлана Стацэнка). Пад якімі нумарамі яны выступяць, стане вядома напярэдадні, вечарам 11 ліпеня. Усяго ў конкурсе сёлета ўдзельнічаюць прадстаўнікі 17 краін.
12 ліпеня, субота, 22.00	Гала-канцэрт майстроў Расіі «Широка страна моя...». У ім чакаюцца Алег Газманаў, Іосіф Кабзон, Варвара, Надзея Бабкіна і ансамбль «Руская песня», Міхаіл Баярскі, дзяржаўны ансамбль танца Карачаева-Чаркесіі і іншыя.
13 ліпеня, нядзеля, 15.00	Міжнародны дзіцячы музычны конкурс «Віцебск-2008», дзень другі. Нагадаем, у першы дзень юным артыстам трэба будзе выканаць песню кампазітара краіны і на мове краіны, якую яны прадстаўляюць, у другі — твор па выбару, каб найбольш ярка раскрыць здольнасці і майстэрства канкурсанта. На кану слаборніцтва — Гран-пры памерам у 5 тысяч долараў, а таксама 1-я, 2-я і 3-я прэміі — 3, 2 і 1 тысяча долараў адпаведна.
13 ліпеня, нядзеля, 18.00	Конкурс маладых выканаўцаў, дзень першы. Сёлета, нагадаем, правілы конкурсу змяніліся: Беларусь, Расія і Украіна, як заснавальнікі фестывалю, прадстаўляюць толькі па адным удзельніку, але затое гэтыя тры артысты трапляюць адразу ў фінал і адпаведна ў тэлеэфір. Паўфінал жа — выступленне 22 канкурсантаў, з якіх далей пройдзе толькі 12 — адбудзецца на дзень раней у канцэртнай зале «Віцебск». Жараб'ёўка фінальных выступленняў пройдзе літаральна апоўначы ў нядзелю. Невядома, які нумар выцягне Віталь Гардзей, які прадстаўляе Беларусь, але затое дакладна вядома, што ў першы конкурсны дзень у суправаджэнні Нацыянальнага канцэртнага аркестра ён выканае баладу Уладзіміра Мулявіна «Крык птушкі».
13 ліпеня, нядзеля, 22.00	Канцэрт, прысвечаны Дню Саюзнай дзяржавы — «Усе кветкі ліпеня». Музычную яго канцэпцыю падрыхтаваў адзін з лаўрэатаў прэміі Саюзнай дзяржавы — кіраўнік Нацыянальнага канцэртнага аркестра Беларусі Міхаіл Фінберг. На сцэне, акрамя таго, з'явяцца Уладзімір Гасцюхін, Аляксей Дударай, Андрэй Пятроў, Галіна Грамовіч, Сяргей Анцішын, Ларыса Грыбалёва, Давід Галашчокін, гурты «Дынаміт», «Чэлсі» і іншыя. Салісты гурта **«Сцэнакардыя»,** напрыклад, у пацвярджэнне беларуска-расійскай творчай дружбы спяюць дуэтам з «Сябрамі» добра вядомую песню «А я лягу, прылягу».
14 ліпеня, панядзелак, 18.00	Гала-канцэрт VI Міжнароднага дзіцячага конкурсу «Віцебск-2008» — «Дзіцячы садок». Акрамя ўласна юных спевакоў з розных краін, у канцэрце выступяць танцавальныя калектывы, артысты цырка Ю. Нікуліна на Цвятным бульвары, сталыя артысты, у тым ліку Эвеліна Анасаўскайтэ (Літва), члены журы конкурсу Канстанцін Масковіч (Малдова), Эмілія Валенці (Балгарыя), Алег Паўлышын (Украіна) ды іншыя. «Разынка» канцэрта — выступленне расійскага ансамбля даўлістаў. Доўл — нацыянальны каўказскі інструмент, гэткі двухбаковы барабан, толькі граюць на ім... рукамі.
14 ліпеня, панядзелак, 22.00	Конкурс маладых выканаўцаў, дзень другі. На гэты раз канкурсантам трэба будзе спяваць у суправаджэнні фанаграмы «мінус 1», для чаго **Віталь Гардзей,** напрыклад, абраў кампазіцыю Уладзіміра Кандрусевіча і Валерыі Куставай «Лісток». У другім аддзяленні канкурсантаў зменіць Лайма Вайкуле.
15 ліпеня, аўторак, 22.00	«ЕўраФэст» прадстаўляе «Зоркі «Еўрабачання». Насамрэч гэты канцэрт стаіць у праграме адным з першых, у ноч з 10 на 11 ліпеня, таму пакаланы будзе ў запісе. У праграме заняўленыя сёлетні пераможца Дзіма Білан — праўда, ужо без лёду і, хутчэй за ўсё, без скрыпкі Страдзівары, а таксама Наталля Падольская, Руслан Аляхно, Дзмітрый Калдун, Ксенія Сітнік, Аляксей Жыгалковіч, армянка Сірушо, ізраільцянін Боаз, украінка Ані Лорак, грэк Костас Мартакіс, дзіцячыя калектывы «Зорка» і «Чараўнікі двара», латышскі гурт «Маркія піраты» і турэцкі гурт «Mor ve otesi» (назва, дарэчы, перакладаецца як «Фіялетавы і ўльтрафіялетавы»).
16 ліпеня, серада, 22.00	Гала-канцэрт майстроў мастацтваў Беларусі «Беларусь — спрадвечная песня». Як паабяцаў рэжысёр-пастаноўшчык канцэрта, кіраўнік Дзяржаўнага ансамбля танца Валянцін Дудкевіч, месца ў праграме, разлічанай на некалькі гадзін, хопіць прадстаўнікам самых розных музычных жанраў і накірункаў. Сапраўды, калі яшчэ ўбачыш на адной сцэне такі калейдаскоп: ранейшых канкурсантаў «Славянскага базару» Марыну Васілеўскую, Гюнеш, Пятра Елфімава, Наталлю Падольскую, заслужаныя калектывы «Сябры», **«Песняры»,** «Бяседа» і малавядомых пакуль што Катрын, Алену Ланскую, Мікіту Фаміных, рок-гурт «J:Морс», фолк-рокавы «Палац» і хрысціянскі «Новы Іерусалім», рыцарскія клубы «Княжыч» і «Ордэн Паўночнага Храма», ды яшчэ ў дапамогу вядучай Алене Спірыдовіч «пяючых вядучых» Веру Палякову і Георгія Калдуна, для паўнаты карціны?
17 ліпеня, чацвер, 22.00	**Руслана** з сольнай праграмай «Амазонка». Да нас спявачка завітае ў перапынку свайго ўсеўкраінскага тура, таму надоўга не затрымаецца. У дзень, калі канцэрт будзе паказаны на Першым канале (у запісе), носьбітка «дзікай энергіі» ўжо будзе прадстаўляць свой аднайменны з праграмай новы альбом «Амазонка» ў Марыупалі.
18 ліпеня, пятніца, 22.00	Урачыстае закрыццё фестывалю. На ім традыцыйна выступяць «зоркі» ўсіх папярэдніх канцэртаў, а таксама ўладальнікі Гран-пры конкурсу маладых выканаўцаў і міжнароднага дзіцячага музычнага конкурсу «Віцебск-2008». Так што ў праграме суседнічаюць «Лесапавал» і Сярога, Сяргей Лазараў і Стас Міхайлаў, Уладзімір Праснякоў і ансамбль «Руская душа», Ганна Шаркунова і Мікалай Скорыкаў, балет Алы Духавай «Тодэс» і арт-гурт «Беларусы». Акрамя таго, перад выступленнем на «Новай хвалі» мае шанц зарадзіцца станоўчай энергетыкай беларускіх прыхільнікаў Іван Вабішчэвіч — саліст гурта «Ван Хельсінг», які прадставіць на канцэрце закрыцця «Славянскага базару» дуэт са спявачкай Дарыяй.

МОВАЙ ЛІЧБАЎ

Усяго, як расказалі нам у прэс-службе Белтэлерадыёкампаніі, для работы на фестывалі ў Віцебск накіруюцца каля 180 спецыялістаў. Акрамя таго, запрошаны прадстаўнікі 14 тэлерадыёвяшчальных арганізацый з Расіі, Украіны, Казахстана, Малдовы, Кубы, Кітая і г.д. Ганаровым госцем фэсту стане дырэктар дэпартамента тэлебачання Еўрапейскага вяшчальнага саюза Б'ёрн Эрыксан.

Будзе задзейнічана вялікая колькасць тэхнікі, у тым ліку і зусім новае абсталяванне — радыёкамера SONY і высакаякасны гукавы пульт, усталяваны на борце тэлевізійнай станцыі. Для забеспячэння трансляцый канцэртаў будуць выкарыстаны дзве перасоўныя тэлевізійныя станцыі, тэлекраны і 5 мантажных станцый, плюс 10 тэлекамер непасрэдна на сцэнічнай пляцоўцы.

Дарэчы, прамыя трансляцыі фестывальных канцэртаў, а таксама іншыя мерапрыемствы «Славянскага базару», будуць дэманстравацца на свяглодыёдным экране каля сталічнага Палаца спорту на праспекце Пераможцаў.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Замор'е

ПАЛІЦЫЮ ВЯЛІКАБРЫТАНІІ ЎЗБРОЯЦЬ БОЛЕВЫМІ ПРАМЯНЯМІ?

Міністэрства ўнутраных спраў Вялікабрытаніі разглядае магчымасць выкарыстаць супраць удзельнікаў вулічных хваляванняў высокатэхналагічныя болевыя прамяні. Менавіта яны павінны стаць альтэрнатывай вадамётам.

Так званая «сістэма актыўнага адводу» (ADS) выпускае мікрахвалевае выпраменьванне на адлегласць больш за 450 метраў, выклікаючы непрыемнае пачуццё пякоты ва ўсім целе ў любога, хто знаходзіцца ў полі дзеяння. Прамяні міліметровага дыяпазону пранікаюць у скуру на глыбіню каля 0,3 мм, але не наносяць пастаянных пашкоджанняў, сцвярджае вытворца гэтага прыстасавання — амерыканская фірма Raytheon. Прататыпы гэтай зброі пад назвай «Ціхі вартавы» важаць каля трох тон і размяшчаюцца на грузавіках.

Даследчы цэнтр МУС, размешчаны ў Сэндрыджы ў графстве Хартфардшыр, звярнуў увагу на пераносную версію ADS, якую Raytheon распрацоўвае для амерыканскага Нацыянальнага інстытута юстыцыі — па апісанні прыстасаванне падазрона нагадвае нешта з фільма «Суддзя Дрэд». Камплект памерам з заплечнік распрацоўваецца для амерыканскай паліцыі, і ўжо створаны працаздольны прататып.

Першы пакупнік у спісе, які прэтэндуе на поўнамасштабную версію ADS, — ваенна-паветраныя сілы ЗША. Нядаўна яны апублікавалі медыцынскі даклад Універсітэта штата Пенсільванія аб наступствах выкарыстання зброі. У дакументе расказваецца аб эфектах выкарыстання прыстасавання ў палявых умовах. Пасля таго як даследчыкі правялі больш за 10 тысяч выпрабавальных стрэлаў з удзелам добраахвотнікаў, 99 працэнтаў паведамілі, што болевы прамень з'яўляецца эфектыўным сродкам стрымлівання. Невялікія апёкі на скуры з'явіліся толькі ў некалькіх паддоследных. Апарат дазваляе страляць «чэргамі» працягласцю ад адной да шасці секундаў на адлегласць да некалькіх соцень ярдаў. Калі адзін з тэхнікаў выпадкова апынуўся паблізу крыніцы выпраменьвання, ён атрымаў апёкі другой ступені, і яму спатрэбілася перасадка скуры. Сёння існуе лазерная зброя — так званыя дэзлеры — якую можна насіць з сабой і з яе дапамогай асляпляць злачынцаў. А кінэтычная зброя ключае несмяротныя патроны, вадамёты і нават гранаты з парашком, які выклікае сверб.

БАБУЛЯ ЗБІВАЕ САЛДАТАЎ

Салдаты раскватараванай у Ліворні Фалгарскай брыгады італьянскага войска церпяць штодзённае збіццё ад 77-гадовай японскай бабулькі. Майстар баявых мастацтваў Кейко Вакабаішы, празваная «Бабуля-Самурай», была нанятая камандаваннем для трэніроўкі навабранцаў.

Нягледзячы на тое, што рост хударлявай бабулькі не перавышае паўтара метра, а рост яе вучняў зашкальвае за метр восемдзесят, яна з лёгкасцю ўкладвае іх на падлогу казармы, пасля чаго заяўляе: «Не думай, што такога не бывае. Фізічныя даныя не маюць значэння». Спадарыня Вакабаішы нарадзілася ў Японіі, але пастаянна жыве ў Паўночнай Італіі. У выніку шматгадовага самаўдасканалення яна стала спецыялістам па джыу-джытсу, дзэ-дзюцу, кэн-дзюцу, дзюдо, кэндо і каратэ. Паводле меркавання Вакабаішы, прынятая ва ўсходніх адзінаборствах сутычка адзін на адзін з'яўляецца найбольш эфектыўным метадам навучання. Камандаванне, у сваю чаргу, лічыць, што штодзённая знявага, якую навабранцы церпяць ад «Бабулі-Самурай», загартуе іх і ператворыць у сапраўдных салдатаў.

КОЖНЫ ДРУГІ ЕЎРАПЕЕЦ — АМАТАР КАМП'ЮТАРНЫХ ГУЛЬНЯЎ

Прыблізна палова ўсяго насельніцтва Еўропы захапляецца камп'ютарнымі гульнямі. Амаль тры чвэрці еўрапейцаў (73 працэнты), у якіх ёсць выхад у Інтэрнэт, гуляюць на PC.

Даследаванне таксама паказала, што 49 працэнтаў апытаных гуляюць на настольным PC, а 23 працэнты аддаюць перавагу для гэтых мэтаў ноўтбуку. Адзначым, што трэцяя частка еўрапейцаў, у якіх ёсць выхад у сетку, гуляюць у відэагульні, аднак насамрэч гульнявымі прыстаўкамі валодаюць значна больш апытаных — прыблізна 41 працэнт. Сярод іх па-ранейшаму папулярная PlayStation 2 — яна ёсць у 60 працэнтаў апытаных геймераў, ігракоў на прыстаўках.

На другім месцы ідзе DS (26 працэнтаў), на трэцім — Game Boy (17), а чацвёртае месца занялі ўладальнікі Wii (16).

Падрыхтаваў Іван КУПАРВАС.

Усміхнёмся!

Маленькі хлопчык падыходзіць да міліцыянера і пытаецца:

— Дзядзька міліцыянер, а навошта ў вас хлясцік на фуражцы?

Той прымае ганарлівую позу і кажа:

— А гэта, хлопчык, калі раптам пагоня, бандыты, а я еду ў машыне, высоўваюся ў акно, каб страляць з пісталета, а вецер дзьме і можа сарваць фуражку, тады я хлясцік апушчу на падбародак і фуражка застанецца ў мяне на галаве.

— А-а, зразумела. А то тата мне казаў, каб твар не разарвала, калі вы ў свісток дзьмяце!

☺

Вясновым прызывам закончылася бойка студэнта з прафесарам...

☺

Учора глядзеў Петрасяна. Дзве гадзіны рагатаў, пакуль жонка фатаграфію не парвала.

10 ліпеня

Дзве даты

1918 год — Пяты Усерасійскі з'езд Саветаў прыняў Канстытуцыю РСФСР — першую канстытуцыю савецкай дзяржавы.

1931 год — у Мінску на базе факультэта народнай гаспадаркі Белдзяржуніверсітэта створаны самастойныя інстытуты: фінансава-эканамічны, планава-эканамічны, спажывецкай кааперацыі (праз год яны былі аб'яднаны ў адзін — Беларускі дзяржаўны інстытут народнай гаспадаркі), а педагагічны факультэт БДУ рэарганізаваны ў Беларускі вышэйшы педагагічны інстытут (цяпер — БДПУ імя М. Танка).

Цытата дня:

«Патрэбна сотня мужчын, каб уладкаваць лагер, але дастаткова адной жанчыны, каб уладкаваць дом».

Роберт Інгерсол (1833—1899), амерыканскі пісьменнік.

Наблюдательный совет ОАО «МЭФЗ»

сообщает, что 24 июля 2008 г. в 16.00

в актовом зале завода по адресу:
г. Минск, ул. Старовиленская, 100 состоится внеочередное собрание акционеров ОАО «Минский экспериментально-фурнитурный завод».

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. О комплексном техническом перевооружении производства ОАО «Минский экспериментально-фурнитурный завод» в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь № 282 от 19.05.2008 г. «О некоторых вопросах Белорусского государственного концерна по производству и реализации товаров легкой промышленности».

УНН 100219829.

Извещение об открытом аукционе по продаже в частную собственность земельных участков под строительство и обслуживание одноквартирных жилых домов

Организатор аукциона — Янушковичский сельский исполнительный комитет Логойского района Минской области

№	Местоположение земельного участка	Кадастровый номер	Площадь земельного участка в га	Назначение земельного участка	Характеристика расположенных на участке строений	Начальная цена объекта в руб.	Сумма задатка руб.
1	Минская обл., Логойский район, Янушковичский с/с, д. Великие Бесяды	62328800160 1000056	0,1385	Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома	Энергоснабжение	90025	9000
2	Минская обл., Логойский район, Янушковичский с/с, д. Великие Бесяды	62328800160 1000057	0,2445	Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома	Энергоснабжение	158930	15900
3	Минская обл., Логойский район, Янушковичский с/с, д. Слижино	62328801460 1000045	0,1107	Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома	Энергоснабжение	119660	11970
4	Минская обл., Логойский район, Янушковичский с/с, д. Янушковичи	62328801810 1000136	0,1679	Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома	Энергоснабжение, возможность подключения к водопроводу	397920	39790
5	Минская обл., Логойский район, Янушковичский с/с, д. Янушковичи	62328801810 1000137	0,2470	Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома	Энергоснабжение, возможность подключения к водопроводу	585390	58540

Аукцион состоится 12 августа в 10.00 в здании Янушковичского исполнительного комитета (актовый зал).
Затраты в размере 10 % от начальной цены перечисляются на р/с 3600619170177 в ф. 611 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Логойск, код 518, УНП 600181536. Оплата за объект должна быть осуществлена в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

УНП 600181536

Чытайце ў наступным нумары

Сумяшчальніцтва ў медыцыне адыдзе ў нябыт?

У Беларусі распрацоўваецца новая сістэма аплаты працы работнікаў аховы здароўя.

Усе пасады медработнікаў ёсць намер аб'яднаць у групы з прыкладна аднолькавым узроўнем аплаты працы. У цэлым такіх груп можа быць 12—13, і ў тым ліку 8—9 – для ўрачоў. Пры гэтым кожная з груп па аплаце працы павінна адпавядаць не якому-небудзь аднаму канкрэтнаму значэнню тарыфнага каэфіцыенту — тут будуць закладзены «відэльцы», інтэрвалы заробку з пэўнай ніжняй і верхняй кропкай.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	4.51	21.38	16.47
Віцебск —	4.33	21.36	17.03
Магілёў —	4.41	21.29	16.48
Гомель —	4.46	21.16	16.30
Гродна —	5.08	21.52	16.44
Брэст —	5.17	21.44	16.27

Месяц

Першая квадра.
Месяц у сузор'і Шаляў.

Імяніны

Пр. *Івана, Марціна.*
К. *Амелія, Антона, Віталя, Філіпа.*

НАДВОР'Е на заўтра

Геамагнітныя ўзрушэнні



...у суседзяў

Віншуем паважаную абаяльную **Марыю Палікарпаўну ДАЎГУЧЫЦ** з юбілеем. Жадаем моцнага здароўя, радасці і шчасця на доўгія гады.

Па даручэнні суседзяў Я. Кісель, г. Старыя Дарогі.

Сардэчна віншуем з днём нараджэння шаноўную **Валянціну Мацвееўну СЛАБАДА.** Жадаем моцнага здароўя, шчасця, каб на ўсё хапала сілаў, каб кожны дзень, пражыты табой, прыносіў толькі радасць.

Суседкі, в. Стараволя.

ЗАКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО
«Кредэксбанк»

ул. Некрасова, 114, 220040, г. Минск, Республика Беларусь
МФО 153001273, УНП 807000030, ОКПО 37560001
Т/факс (+375 17) 287 83 21
E-mail:mail@credexbank.by
S.W.I.F.T.NOIBBY2X Телекс: 252100 NIBBY

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
на 1 июля 2008 г. *(в миллионах белорусских рублей)*

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	2008 год	2007 год
1	2	3	4	5	6
1	**АКТИВЫ**				
2	Денежные средства	1101	1	386,8	—
3	Средства в Национальном банке	1102	2	522,4	364,3
4	Ценные бумаги	1103		2 004,5	1 905,4
	для торговли	11031	3	—	—
	удерживаемые до погашения	11032	3.1	2 004,5	1 905,4
	в наличии для продажи	11033	3.2	—	—
5	Кредиты и другие средства в банках	1105	4	18 718,4	16 472,6
6	Кредиты клиентам	1106	5	15 162,6	—
7	Долгосрочные финансовые вложения	1107	6	—	—
8	Основные средства и нематериальные активы	1108	7	451,5	151,0
9	Прочие активы	1109	8	698,5	52,0
10	ИТОГО активы	110		37 944,7	18 945,3
11	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**				
12	Средства Национального банка	1202	9	—	—
13	Кредиты и другие средства банков	1205	10	—	—
14	Средства клиентов	1206	11	4 809,5	1 998,4
15	Ценные бумаги, выпущенные банком	1208		—	—
16	Прочие обязательства	1209	12	319,1	7,2
17	ВСЕГО обязательства	120		5 128,6	2 005,6
18	**КАПИТАЛ**				
19	Уставный фонд	1211	12	24 677,5	14 201,4
20	Эмиссионный доход	1212		—	—
21	Резервный фонд	1213		3 880,9	488,7
22	Накопленная прибыль	1214	14	4 250,4	2 248,7
23	Фонд переоценки статей баланса	1215	15	7,4	0,9
24	ВСЕГО капитал	121		32 816,2	16 939,7
25	ИТОГО обязательства и капитал	12		37 944,8	18 945,3
26	**ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ**				
27	Требования	1301	16	48 452,8	39 242,3
28	Обязательства	1302	17	47 156,2	39 232,0

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ
на 1 июля 2008 г. *(в миллионах белорусских рублей)*

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	2008 год	2007 год
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011		1 825,8	983,2
2	Процентные расходы	2012		77,5	2,0
3	Чистые процентные доходы	201	18	1 748,3	981,2
4	Комиссионные доходы	2021		1 289,9	378,4
5	Комиссионные расходы	2022		731,6	208,4
6	Чистые комиссионные доходы	202	19	558,3	170,0
7	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	203	20	3 897,5	1 467,7
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	21	—	—
9	Доход в форме дивидендов	205		—	—
10	Чистые отчисления в резервы	206	22	—	—
11	Прочие доходы	207	23	127,0	—
12	Операционные расходы	208	24	1 886,6	505,3
13	Прочие расходы	209	25	87,5	27,0
14	Налог на прибыль	210		829,7	338,0
15	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2		3 527,3	1 748,6

Генеральный директор **Т.И. Жевняк**
Главный бухгалтер **Т.Н. Дылько**

Лицензия на осуществление банковских операций № 19 от 28.01.2008 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 24 31 92, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

http://www.zviazda.by; www.zviazda.by/ru/main (*новая версія, якая тэсцiруецца*)

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значкам, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.791 Індэкс 63850. Зак. № 3630. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12